Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

29 СТУДЗЕНЯ 2008 г.
АЎТОРАК
№ 17 (26130)

Кошт 430 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прэзідэнт Беларусі даручыў распрацаваць новы механізм аплаты працы ўрачоў вузкіх спецыяльнасцяў

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 28 студзеня правёў рабочую нараду па пытаннях развіцця сістэмы аховы здароўя, у тым ліку перспектывах дзейнасці Дзяржаўнай установы «Рэспубліканская бальніца» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Міністр аховы здароўя Беларусі Васіль Жарко праінфармаваў аб бягучым становішчы спраў у медыцынскай галіне і перспектывах дзейнасці Міністэрства аховы здароўя. Прэзідэнт паставіў задачу да 2010 года цалкам завяршыць рэканструкцыю ўсіх лячэбных установ, якія павінны адпавядаць сусветнаму ўзроўню.

У ходзе мерапрыемства закраналіся пытанні павышэння заработнай платы ўрачоў. Міністэрству працы і сацабароны даручана распрацаваць новы механізм аплаты працы ўрачоў вузкіх спецыяльнасцяў. Разгледжаны пытанні будаўніцтва ЖБК для медыкаў, у тым ліку маладых спецыялістаў, з улікам вастрыні жыллёвага пытання для гэтай катэгорыі работнікаў. На сустрэчы абмяркоўваліся таксама пытанні ўпарадкавання сістэмы Мінздрава, мадэрнізацыі клінік і раённых бальніц.

Прэзідэнт назваў «ненармальнай» сітуацыю, калі шэраг устаноў аховы здароўя ў краіне практычна не залежыць ад Мінздрава. На думку Кіраўніка дзяржавы, Міністэрства павінна праводзіць актыўную палітыку па ўсіх накірунках (гэта датычыцца не толькі метадычных, але і кадравых, арганізацыйных пытанняў), а таксама ажыццяўляць эфектыўны кантроль за дзейнасцю ўсёй сістэмы аховы здароўя. Размова ідзе, у прыватнасці, аб медустановах КДБ, МУС, Міністэрства абароны, Беларускай чыгункі, а таксама ДУ «Рэспубліканская бальніца» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта. Мінздраў павінен мець адпаведныя паўнамоцтвы і рычагі кіравання гэтай сістэмай і несці адказнасць за яе дзейнасць, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на тым, што ў краіне неабходна стварыць некалькі буйных медыцынскіх цэнтраў па розных накірунках, якія павінны стаць арыенцірамі для іншых устаноў аховы здароўя рэспублікі. Прэзідэнт у гэтай сувязі адзначыў: «Большасць бальніц у краіне маюць універсальную накіраванасць і аказваюць розную медыцынскую дапамогу. Такой з'яўляецца і Рэспубліканская бальніца. Вельмі важна на яе базе стварыць такі клінічны цэнтр, які стане ўзорам. Тут маюцца нядрэнная база, добрае аснашчэнне. Не трэба Мінздраву траціць грошы на стварэнне нейкай іншай школы, трэба ўзяць за ўзор Рэспубліканскую бальніцу і падцягваць астатнія да гэтага ўзроўню».

Аляксандр Лукашэнка асабліва акцэнтаваў увагу на важнасці ролі Міністэрства аховы здароўя ў стварэнні на базе Рэспубліканскай бальніцы цэнтра, у якім трэба будзе сканцэнтраваць найноўшыя тэхналогіі, а таксама медыцынскую эліту — высокакваліфікаваных спецыялістаў. Размова ішла аб пытаннях кадравай палітыкі і стварэння ў рамках цэнтра клінічных баз, падрыхтоўцы на іх спецыялістаў для ўсёй краіны. Узгоднена будаўніцтва новага лячэбна-дыягнастычнага корпуса Рэспубліканскай бальніцы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Святланы КРАЎЧУК.

На пагранпераходзе «Варшаўскі мост» — непрывычная пустата. Такога не памятаюць і старажылы, бо і ў савецкія часы «Варшаўскі мост» быў варотамі за мяжу, а ў постсавецкія часта станавіўся пачаткам шматкіламетровых чэргаў аўтатранспарту. Напрыканцы мінулага тыдня ўсё памянялася ў сувязі з праблемамі ўнутры польскай мытні. Яе служачыя дабіваюцца павелічэння зарплаты і іншых сацыяльных выгод. А церпяць тыя, каму трэба перасякаць мяжу.

З нашага боку ніякіх машын няма. Людзі валодаюць інфармацыяй і стараюцца знайсці нейкае выйсце: некаторыя пакінулі машыны ў Брэсце, паехалі далей цягніком або наогул адмянілі паездку. Дзяжурны памежнік сказаў, што за ўсю сваю службу бачыць такое ўпершыню. А начальнік змены на ўсякі выпадак забараніў фатаграфаваць. Яно і зразумела, у яго практыцы такое таксама ўпершыню, вось службовыя асобы і не ведаюць як сябе паводзіць.

Кіраўнік прэс-службы Брэсцкага пагранатрада Дзмітрый Дзевятаў сказаў, што ніякай новай інфармацыяй пакуль не валодае. За дзень зараз цераз мяжу праходзіць столькі машын, колькі раней за гадзіну. Усе надзеі і памежнікі, і мытнікі звязваюць з перамовамі паміж беларускім і польскім бакамі, якія пачынаюцца ў панядзелак бліжэй да вечара на тэрмінале «Казловічы».

На пераходзе грузавога аўтатранспарту «Казловічы—Кукурыкі» таксама непрывычная цішыня. За хвілін сорак з варот выехала адна фура. Яе вадзіцель, польскі грамадзянін, які адрэкамендаваўся Марэкам, сваёй радасці не хаваў: «Мне пашанцавала, адстаяў некалькі гадзін і прапусцілі, бо ў мяне тавар, які хутка псуецца. А некаторыя стаяць другія суткі. І нікто нічога не ведае, як будзе далей».

Адны гавораць пра дваццацікіламетровыя чэргі аўтамабіляў з польскага боку, іншыя называюць яшчэ большыя лічбы. Зразумела, што такія простоі псуюць нервы і наносяць матэрыяльны ўрон кампаніям-адпраўшчыкам. Прыкладна такая ж сітуацыя і на ўкраінска-польскай мяжы. Таму нашы вадзіцелі развіталіся з задумкай перасячы мяжу праз украінскія пераходы.

Паводле інфармацыі прэс-службы Брэсцкай мытні, грузапаток тавараў на выездзе з Беларусі скараціўся ў пяць разоў, а на ўездзе — у 10. Аўтапаязды, перад якімі стаіць задача трапіць у краіны Еўропы, знаходзяцца зараз на пагранічным тэрмінале, які належыць прадпрыемству «Брэстгрузаўтасэрвіс». Там зараз стаіць 400 велікагрузных машын. Як сказаў карэспандэнту «Звязды» дырэктар прадпрыемства Віктар Краўчук, для вадзіцеляў створаны нармальныя ўмовы. Харчовы блок працуе з васьмі вечара да 12 ночы. Ёсць тэлефон, медпункт, забяспечаны санітарныя зручнасці, працуе банкаўскі кіёск. Дальнабойшчыкі маюць магчымасць пакінуць на некаторы час машыны, не апасаючыся за груз і транспарт, і выехаць у горад. Паводле слоў Віктара Дзмітрыевіча, у гэтыя дні не раз даводзілася чуць словы падзякі з вуснаў расійскіх кіроўцаў за тое, што беларусы не пакінулі самнасам з праблемай, а забяспечылі магчымасць перачакаць нягоды ў цывілізаваных умовах.

На тэрмінале працуюць службовыя асобы мытнага камітэта, і афармленне пэўнай часткі грузаў праводзіцца на месцы чакання.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

«Перамяшчэнне грузаў і пасажыраў праз пункты пропуску на беларуска-польскім участку мяжы практычна паралізавана»

З 9 гадзін раніцы 25 студзеня польскія мытныя службы праводзяць забастоўку.

Згодна з аператыўнай інфармацыяй, што паступае ад службаў транспартнай інспекцыі Мінтранса Беларусі, якая выконвае аўтатранспартны кантроль на беларуска-польскім участку мяжы, у выніку гэтага ў міжнародных пунктах пропуску на мяжы «Варшаўскі мост», «Пясчатка», «Дамачава» пропуск аўтатранспарту абмежаваны. З 20 гадзін 25 студзеня да забастоўкі далучыліся супрацоўнікі польскіх мытных службаў, размешчаных у пунктах пропуску «Баброўнікі» — «Бераставіца», «Кузніца» — «Брузгі».

— На сёння ўжо можна гаварыць пра тое, што перамяшчэнне грузаў і пасажыраў аўтамабільным транспартам праз беларуска-польскі ўчастак мяжы ва ўсіх указаных пунктах пропуску практычна паралізаванае, — канстатуе прэс-служба Мін-транса.

У прыватнасці, аператыўная інфармацыя аб наяўнасці чэргаў у аўтамабільных пунктах пропуску на 9 гадзін 28 студзеня была наступнай. Філіял па Брэсцкай вобласці «Казловічы» — «Кукурыкі» (Польшча): чаканне чаргі на ўезд у Рэспубліку Беларусь 45 кіламетраў — 1800 аўтатранспартных сродкаў. Філіял па Гродзенскай вобласці «Бераставіца»: чаканне чаргі на ўезд у Беларусь і праходжанне афармлення складае 12 кіламетраў — 500 аўтатранспартных сродкаў; «Брузгі»: адпаведна 13 кіламетраў і 550 аўтатранспартных сродкаў; «Каменны Лог»: чаканне чаргі на ўезд у Рэспубліку Беларусь і праходжанне афармлення складае 0,7 кіламетра; «Прывалка» — чарга 0,5 кіламетра. Па філіялах Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей чэргаў няма.

Зараз на ўказаных вышэй пунктах пропуску адбываецца пропуск аўтатранспартных сродкаў, якія перавозяць хуткапсавальныя грузы і дыпламатычную пошту, выконваюць рэгулярныя пасажырскія перавозкі, а таксама транспартныя сродкі дыпламатычнага корпуса.

Беларускім перавозчыкам рэкамендавана накіроўваць свае транспартныя сродкі на іншыя пункты пропуску, а таксама па магчымасці ўстрымлівацца ў бліжэйшы час ад паездак у Рэспубліку Польшча. Мінтранс нашай краіны накіраваў у Міністэрства інфраструктуры Польшчы зварот, у якім, у прыватнасці, папрасіў аказаць садзейнічанне ва ўрэгуляванні сітуацыі, што склалася. Адначасова наша міністэрства праводзіць арганізацыйную работу па пераарыентаванні руху транзітнага аўтатранспарту ў заходнім накірунку, накіраваўшы асноўны паток праз беларуска-літоўскі ўчастак мяжы.

Мінтранс таксама звярнуўся ў Дзяржаўны мытны камітэт краіны з прапановай прыняць меры для аператыўнага змянення пунктаў мытнага афармлення — каб пазбегнуць працяглых простояў перавозчыкаў у пунктах, па якіх польскімі мытнымі службамі часова не праводзіцца мытнае афармленне. Пры гэтым Мінтранс прапрацоўвае магчымасць арганізацыі адстою транспартных сродкаў на стаянках (пляцоўках) у непасрэднай блізкасці ад мяжы. Дадзеная мера дазваляе ўжо сёння арганізаваць цывілізаваны пропуск аўтатранспартных сродкаў, пазбегнуць скаплення аўтатранспарту непасрэдна на мяжы, гавораць у міністэрстве. «Перавозчыкам створаны ўсе необходныя ўмовы для забеспячэння выццядзейнасці, арганізавана дастаўка гарачага харчавання і ўмовы для адпачынку вадзіцеляў».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Колькасць міжнародных наглядальнікаў на парламенцкіх выбарах у Беларусі абмяжоўвацца не будзе

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 28 студзеня прыняў старшыню Цэнтрвыбаркама Лідзію Ярмошыну. Кіраўнік дзяржавы і кіраўнік ЦВК абмеркавалі аспекты маючай адбыцца выбарчай кампаніі — яе перыяды, а таксама некаторыя канцэптуальныя пытанні правядзення парламенцкіх выбараў.

У гэтым годзе завяршаецца тэрмін паўнамоцтваў абедзвюх палат парламента — Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. У адпаведнасці з Канстытуцыяй Прэзідэнт Беларусі назначае выбары ў Палату прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі.

Выбары павінны адбыцца не пазней за 12 кастрычніка. З улікам таго, што па Канстытуцыі прадугледжана магчымасць правядзення двух тураў галасавання, найбольш верагодна, што выбары пройдуць у канцы верасня. Значыць, выбарчая кампанія афіцыйна пачнецца ў канцы чэрвеня гэтага года. Выбары павінны прайсці галосна і дэмакратычна. У ходзе іх правядзення будзе выкарыстаны інстытут члена камісіі з правам дарадчага голаса, які добра зарэкамендаваў сябе. Палітычныя партыі, якія вылучаць сваіх прадстаўнікоў кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, змогуць накіраваць свайго прадстаўніка ў склад Цэнтрвыбаркама на час правядзення выбараў. Прадстаўнікі палітычных партый змогуць прымаць удзел у абмеркаванні ўсіх пытанняў і праблем, якія будуць разглядацца ЦВК. Кіраўнік дзяржавы і кіраўнік ЦВК абмеркавалі таксама пытанні міжнароднага назірання за выбарамі. Прэзідэнт яшчэ раз падкрэсліў, што міжнародныя наглядальнікі будуць запрошаны на выбары. Прычым у той колькасці, у якой пажадаюць і палічаць патрэбным тыя міжнародныя арганізацыі, што будуць прыцягнуты да ўдзелу ў выбарах. І АБСЕ, і СНД, якія, як правіла, накіроўваюць свае місіі, ніяк не будуць абмежаваны ў колькасным складзе гэтых місій.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ТЫДЗЕНЬ НЯЎСТОЙЛІВАГА НАДВОР'Я

На гэтым тыдні адзін за адным на тэрыторыю Беларусі будуць рухацца праз Скандынавію актыўныя цыклоны, якія прынясуць нам цёплае і вільготнае паветра з боку Атлантыкі, — паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.

Таму чакаецца адносна цёплае надвор'е з сярэднясутачнай тэмпературай на 3—6 градусаў вышэй за кліматычную норму.

Удзень у аўторак невялікі мокры снег чакаецца месцамі па Брэсцкай, Гродзенскай, Віцебскай і Мінскай абласцях. Тэмпература паветра — ад 3 градусаў марозу да 3 цяпла. У сераду невялікія ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу чакаюцца толькі на ўсходзе краіны. Месцамі туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы — ад 0 да 6 градусаў марозу, удзень — мінус 1 — плюс 4 градусы. У чацвер уначы па паўночна-заходняй палове, а ўдзень паўсюдна будуць назірацца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай туман і галалёд. Тэмпература паветра на працягу сутак — мінус 3 — плюс 3 градусы.

У выхадныя дні актыўныя атмасферныя франты зноў прыцягнуць да нас ападкі. У суботу чакаецца мокры снег і дождж, у асобных раёнах парывы ветру будуць дасягаць 15—20 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак ад мінус 2 да плюс 4 градусаў. А вось у нядзелю стане крыху халадней. Ападкі будуць ісці ўжо ў выглядзе кароткачасовага снегу. Тэмпература паветра ўначы 1—7 градусаў марозу, удзень — ад мінус 1 да плюс 4 градусаў. Згодна з доўгатэрміновымі прагнозамі, у пачатку наступнага тыдня зноў павінна пацяплець. Моцных маразоў нават у пачатку лютага сіноптыкі пакуль не прадказваюць.

Сяргей КУРКАЧ.

ВЫРАТАВАЛІ РЫБАКОЎ

На рацэ Мухавец у Брэсце пад лёд праваліліся трое рыбакоў-аматараў. Вялікімі намаганнямі выратавальнікаў падраздзялення МНС людзей удалося вызваліць з ледзянога палону. Пры гэтым у ваду правальваўся нават адзін з выратавальнікаў. Рыбакоў давялося шпіталізаваць.

Яна СВЕТАВА.

РАЗГУЛЯЎСЯ ВЕЦЕР

У выхадныя дні на Брэстчыне быў моцны вецер. Парывы яго, што даходзілі да 16—20 метраў у секунду, сталі прычынай парушэння электразабеспячэння ў 92 населеных пунктах 13 раёнаў вобласці. Без свету на некаторы час заставаліся дзве школы, 18 сельскагаспадарчых устаноў, 126 трансфарматарных падстанцый. З трох дамоў і 15 сельгаспабудоў вецер паздзіраў шыфер. Паводле інфармацыі прэс-службы абласнога ўпраўлення МНС, наступствы разгулу стыхіі ліквідаваліся аператыўна.

Яна СВЕТАВА.

Для адных — водпуск, для іншых — вымушаны прастой

— Мы ўзмацніліся і гатовыя ў любы момант да завяршэння гэтай канфліктнай сітуацыі і вялікага наплыву транспартных сродкаў, — паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік Гродзенскай рэгіянальнай мытні Юрый Сянько. — Аднак пакуль што (гутарка адбылася ўчора каля 11 гадзін. — **Б.П.**) сітуацыя ў пунктах пропуску не нармалізавалася. Мы працуем у залежнасці ад таго, колькі транспарту нам аддадуць і колькі ад нас прымуць, але гэта невялікая колькасць.

Мізэрныя ў параўнанні са звычайным рэжымам аб'ёмы мытнага афармлення транспартных сродкаў тлумачацца тым, што на пагранпераходах з польскага боку свае абавязкі выконваюць толькі па аднаму-два супрацоўнікі ў кожным накірунку. У ноч з 27 на 28 студзеня на польскай тэрыторыі ў Баброўніках працаваў толькі адзін мытнік — па чарзе то на ўезд, то на выезд. Гэта, зразумела, адбілася на нізкай прапускной здольнасці пагранперахода. У Бераставіцы чарга грузавых транспартных сродкаў на выезд складала 4 кіламетры, у Брузгах — 1 кіламетр. Яны ўжо суткі чакалі перасячэння мяжы. У Баброўніках на ўездзе на беларускую тэрыторыю ўтварылася адзінацыцікіламетровая чарга, у Кузніцы Беластоцкай — васьмікіламетровая. А кожны кіламетр — гэта прыкладна 40 грузавых машын.

Паводле інфармацыі Юрыя Сянько, кіраўніцтва Беластоцкай мытнай палаты спрабуе зняць напружанасць: у панядзелак у дзённую змену на пагранічныя пункты былі накіраваны супрацоўнікі адміністрацыі палаты, якія могуць выконваць функцыі па мытным афармленні. Што ж датычыцца мытнікаў, то хтосьці з іх знаходзіцца ў водпуску, хтосьці хварэе і на сваіх рабочых месцах яны ў асноўным адсутнічаюць. Праўда, ёсць інфармацыя, што гэта пытанне ў панядзелак павінен быў разгледзець польскі ўрад з тым, каб да канца дня выпрацаваць адпаведнае рашэнне.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Ігар БРОЎКА:

«УКЛАДАННІ Ў МЕДЫЦЫНУ ЗАЎСЁДЫ МАЮЦЬ КАНКРЭТНЫ ВЫНІК»

Апошнім часам у галіне аховы здароўя адбываецца шэраг кардынальных змяненняў. Усе яны ў першую чаргу скіраваны на тое, каб палепшыць якасць, павялічыць даступнасць медыцынскага сэрвісу. Адзначаюцца пазітыўныя зрухі ў дэмаграфічнай сітуацыі, а таксама па паказчыках стану здароўя насельніцтва. Што ўдалося зрабіць ужо зараз, якіх вынікаў мяркуецца дасягнуць? На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае начальнік управлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Ігар Броўка.

«На ахову здароўя — 4,7 працэнта ВУП»

— Мінулы год быў надзвычай інтэнсіўны ў плане мадэрнізацыі — практычна завершана перааснашчэнне аперацыйных і рэанімацыйных залаў усіх цэнтральных раённых бальніц, — адзначае Ігар Уладзіміравіч. — Засталося літаральна некалькі медыцынскіх устаноў, дзе ўсе неабходныя работы будуць праведзены ў самы бліжэйшы час. Такім чынам, будзе паспяхова ўвасоблена ў жыццё двухгадовая дзяржаўная праграма па ўдасканаленні развіцця галіны аховы здароўя. Усё гэта дазволіць не толькі рэальна палепшыць якасць абслугоўвання, але і ўмовы працы медперсаналу. Паколькі разам з мадэрнізацыяй у цэнтральных раённых бальніцах праводзіліся бягучыя рамонты.

Летась завершана рэканструкцыя дзевяціпавярховага корпусу рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія», інстытута траўматалогіі, а таксама аперацыйнага і рэанімацыйнага аддзялення інстытута анкалогіі. У гэты час аб'ёмы і якасць аказання медыцынскай дапамогі ніколькі не пагоршыліся, шмат у чым сітуацыя нават палепшылася. У выніку мадэрнізацыі стала магчымым больш інтэнсіўнае выкарыстанне высокатэхналагічных метадаў як дыягностыкі, так і лячэння. Пэўная колькасць запатрабаваных сучасных метадык пакуль не прымяняецца, таму па даручэнні ўрада Міністэрствам аховы здароўя зацверджана ведамасная праграма па распрацоўцы і ўкараненні высокіх тэхналогій на перыяд да 2010 года, дзе адпаведныя дзеянні распісаны па ўсіх накірунках і службах.

Сёлета плануецца пачаць мадэрнізацыю абласных і гарадскіх дзіцячых бальніц. Таксама, як мяркуецца, поўнасцю будзе выкананы медыцынскі раздзел Праграмы адраджэння і развіцця вёскі — пачынаючы ад фельдшарска-акушэрскіх пунктаў і да цэнтральных раённых бальніц. Пачалася рэканструкцыя рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі, работы тут працягнуцца і налета. На базе сталічнай дзевятай клінічнай бальніцы ствараецца РНПЦ па перасадцы органаў і тканак. Плануецца, што гэты цэнтр пачне працаваць ужо напрыканцы наступнага года. Як бачым, рэканструкцыя, тэхнічнае перааснашчэнне адбываюцца на ўсіх узроўнях аказання медыцынскай дапамогі — ад першаснага да вышэйшага. Гэта сведчыць аб тым, што ў сістэме аховы здароўя сапраўды адбываюцца якасныя змяненні, якія дазволяць рэальна павысіць узровень абслугоўвання, у спецыялістаў і, адпаведна, у пацыентаў з'яўляюцца новыя магчымасці.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Фота аўтара.
(Заканчэнне у наступным нумары.)

Беларусы і расіяне апелююць да Еўракамісіі

Кіраўнікі мытных службаў Беларусі і Расіі звярнуліся ў Еўрапейскую камісію з паўторным заклікам аб прыняцці неадкладных мераў па нармалізацыі сітуацыі ў пунктах пропуску на польскім участку мяжы ЕС.

Пра гэта «Звяздзе» паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта (ДМК) нашай краіны. Нагадаем, што першая сумесная заява беларускіх і расійскіх мытных службаў была зроблена ў мінулыя выхадныя, калі з-за спынення працы польскіх мытнікаў у пунктах пропуску ўтварыліся даўжэзныя чэргі. А паколькі істотных зрухаў у лепшы бок не адбылося, то нашы і расійскія мытнікі вырашылі паўтарыць свой запыт у Еўракамісіі.

Са свайго боку беларускія мытныя органы, як запэўнілі ў ДМК, робяць усё магчымае, каб не выпусціць сітуацыю з-пад кантролю. У раёнах, дзе сабралася вялікая колькасць аўтатранспарту, наладжана ахова парадку, арганізавана праца пунктаў грамадскага харчавання і медыцынскай дапамогі. Калі рух на пагранпераходах будзе адноўлены, то беларускія мытнікі гатовы несці службу ва ўзмоцненым рэжыме, каб як мага хутчэй ліквідаваць «забастовачныя заторы». Транспартным кампаніям, якія сталі ахвярамі забастоўкі польскіх мытнікаў, ДМК Беларусі раіць накіроўваць свае прэтэнзіі і патрабаванні аб кампенсацыі ўрону ў адпаведныя інстанцыі Еўрасаюза.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ ГАСПАДАРЧЫХ СУДОЎ

Днямі адкрылі новы будынак гаспадарчага суда Мінска.

Сярод гасцей — намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталля Пяткевіч, старшыня Вярхоўнага Суда Валянцін Сукала, Генеральны пракурор краіны Пётр Міклашэвіч, мэр Мінска Міхаіл Паўлаў, міністр юстыцыі Віктар Галаванаў, а таксама старшыня Арбітражнага суда Масквы Алег Свірыдэнка.

На цырымоніі старшыні суда Ігару Ждановічу ўручылі сімвалічны ключ. Наталля Пяткевіч адзначыла:

Сёння мы павінны ўзняць на якасна новы ўзровень рэалізацыю функцый гаспадарчых судоў не толькі сталіцы, але і краіны ў цэлым. На такі ўзровень, які ў поўнай меры будзе адпавядаць патрабаванням «дзяржава для народа».

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК

ТРАДИЦИИ НАДЕЖНОСТЬ КОМПЕТЕНТНОСТЬ

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении внеочередного Общего собрания акционеров Открытого акционерного общества «Белвнешэкономбанк»в заочной форме

Открытое акционерное общество «Белвнешэкономбанк», расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, сообщает о проведении 11 февраля 2008 г. внеочередного Общего собрания акционеров в заочной форме.

ПОВЕСТКА ДНЯ ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

1. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Симаш О.М.
2. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Буланчиковой Н.Б.
3. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Мороз Е.И.
4. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Шевченко А.П.
5. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Отделу образования администрации Центрального района города Гомеля.
6. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи Государственному учреждению образования «Улуковская вспомогательная школа-интернат для детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей, Гомельского района».
7. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Управлению образования администрации Московского района города Минска.
8. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Государственному учреждению образования «Специальный детский дом № 3 г. Минска для детей-сирот с особенностями психофизического развития».
9. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Обществу с ограниченной ответственностью «Гандбольный спортивный клуб «БНТУ-БелАЗ».
10. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Приходу храма святого Архангела Михаила в городе Минске Минской епархии Белорусской православной церкви.
11. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Приходу храма Рождества Иоанна Предтечи деревни Олехновичи, Молодечненского района.

Список лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, составлен на основании данных реестра владельцев акций ОАО «Белвнешэкономбанк», сформированного на 25 января 2008 г.

Лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут ознакомиться с решением о проведении Общего собрания акционеров ОАО «Белвнешэкономбанк» в заочной форме, другой необходимой информацией и заполнить бюллетени для заочного голосования, начиная со дня опубликования данного извещения, ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 9.00 до 13.00, по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6, ком. 707, а также в филиалах ОАО «Белвнешэкономбанк».

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть представлены в ОАО «Белвнешэкономбанк» не позднее 7 февраля 2008 г. по адресу: Республика Беларусь, 220073, г. Минск, ул. Скрыганова, 6, ком. 707, почтой, нарочным либо по факсу (8017) 209 25 48 с обязательной доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Дополнительная информация по телефонам: (8017) 209 24 21, 209 25 40.

УНП 100010078

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.01.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 150,00
1 еўра	3 162,97
1 латвійскі лат	4 535,39
1 літоўскі літ	915,52
1 чэшская крона	122,37
1 польскі злоты	873,36
1 расійскі рубель	87,42
1 украінская грыўня	424,75

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрбанк РФ

USD	24,5952
10 UAH	48,2316
1000 BYR	11,4177
EUR	36,1033

Курс у гандлёвых кампаніях (на 28.01.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ISSN 1990 - 763X

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

ДЗЯРЖАВА БУДЗЕ ПАДТРЫМЛІВАЦЬ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНУЮ ЭЛІТУ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў дзеячаў навукі, работнікаў навукова-даследчых інстытутаў і вышэйшых навучальных устаноў з прафесійным святам — Днём беларускай навукі.

«Сёння навука з'яўляецца неад'емнай часткай вытворчага патэнцыялу краіны, базай яе інавацыйнага развіцця. Даследаванні айчынных вучоных у многім вызначаюць будучыню нашай дзяржавы, дынаміку росту дабрабыту яе грамадзян», — гаворыцца ў віншаванні. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што дзяржава ўдзяляе першарадную ўвагу сваёй інтэлектуальнай эліце, яе сацыяльнаму і матэрыяльнаму дабрабыту. «Мы будзем і ў далейшым праводзіць палітыку па ўмацаванні аўтарытэту вучоных, рабіць захады па прыцягненні маладых кадраў у навуку», — запэўніў Прэзідэнт.

БЕЛТА.

Аляксандр КОСІНЕЦ:

«З ТУРКМЕНІСТАНАМ БУДЗЕМ СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ ПА ЎСІХ КЛЮЧАВЫХ ГАЛІНАХ...»

Да 2010 года тавараабарот паміж нашай краінай і Туркменістанам можа павялічыцца да 1 мільярда долараў. Толькі летась ён стаў большым, у параўнанні з папярэднім годам, у сем разоў і перасягнуў мяжу ў 90 мільёнаў долараў. Краіны мяркуюць развіваць супрацоўніцтва, з гэтай нагоды ў Мінску прайшло пасяджэнне сумеснай міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве. Яе ўдзельнікі падрыхтавалі падмурак да візіту ў нашу дзяржаву прэзідэнта Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедава.

Віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Аляксандр Косінец адзначае:

— Будзем наладжваць узаемавыгадныя кантакты ў прамысловасці, у тым ліку і тэкстыльнай, у сельскай гаспадарцы, у паліўна-энергетычнай і нафтахімічнай галінах, будаўніцтве. На першым пасяджэнні гандлёва-эканамічнай камісіі мы ўбачылі вялікія рэзервы для супрацоўніцтва нашых краін. Мы можам рэанімаваць старыя свідравіны, маем добрыя магчымасці для правядзення геолага-разведвальных работ, прапануем якасны і эфектыўны рамонт газаправодаў. Беларускі інстытут будаўнічай індустрыі можа аказваць паслугі па ўзвядзенні дарог і мастоў. Вызначыліся ўжо сур'ёзныя элементы партнёрства ў адукацыі, культуры, ахове здароўя.

Госці з Туркменістана завіталі ў Нацыянальную бібліятэку, наведалі Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, Мінскі трактарны завод. Было разгледжана пытанне наконт павелічэння паставак аўтобусаў, трактароў, аўтатэхнікі ў Туркменістан.

— Машынабудаўнічы патэнцыял вашай краіны вельмі ўражвае. Мы маем вопыт работы з беларускай сельскагаспадарчай тэхнікай, штогод набываем яе на Мінскім трактарным заводзе, і гэта працягнецца ў будучым, — каментуе Хыдыр Сапарлыеў, намеснік старшыні Кабінета Міністраў Туркменістана. Усе галоўныя пытанні будуць вырашаны ў ходзе візіту прэзідэнта Туркменістана ў Беларусь.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

Па чутках і кампетэнтна

ФІНАНСАВЫЯ РЫНКІ ЗНОЎ ЛІХАМАНІЦЬ

Не памыліліся тыя эксперты, якія на мінулым тыдні казалі пра «другую хвалю падзення на фінансавых рынках свету». Нягледзячы на тое, што з серады па пятніцу, як здавалася, тут сітуацыя пачала выпраўляцца, у панядзелак негатыўны настрой зноў справакаваў падзенне акцый: паводле даных інфармагенцтваў, біржавыя індэксы абваліліся на ўсіх вядучых фінансавых рынках Усходняй Азіі — рэгіёна планеты, які сама дынамічнай развіваецца, дзе бізнэсмены ўзрушаны нарастаннем крызісных з'яў у эканоміцы ЗША.

Расійская біржа адрэагавала адпаведна — назіралася падзенне вядучых індэксаў. На думку экспертаў, апошнія падзеі адлюстроўваюць сённяшні настрой інвестараў, у якіх няма веры ў тое, што сітуацыя ў эканоміцы Злучаных Штатаў можа выправіцца. «Падлілі масла ў агонь», лічаць таксама аналітыкі, палітыкі і вядучыя бізнэсмены, якія разварушылі трэйдэраў трывожнымі заявамі аб сітуацыі ў сусветнай гаспадарцы падчас Сусветнага эканамічнага форуму ў Давосе.

— На мой погляд, крыніца праблемы, якая вылілася на фінансавыя рынкі, — у крызісе іпатэчнага крэдытавання ЗША, — каментуе «Звязде» апошнія падзеі старшыня Асацыяцыі беларускіх банкаў Фелікс Чарняўскі. — Да таго ж амерыканскі рынак сціскаецца з-за таго, што ў гэтай краіне паніжаецца попыт на тавары. Гэтыя праблемы і дыктуюць настрой фондавым рынкам, дзе назіраюцца істотныя хістанні індэксаў. Не стаў бы я выключаць і таго, што карыстаючыся выпадкам, на рынках уключыліся ў работу і спекулянты.

Што датычыцца нашай краіны, то падстаў для хвалявання няма: на знешніх рынках адсутнічаюць нашы каштоўныя паперы, і таму біржавая ліхаманка не павінна нас зачапіць. Рубель у нас застаецца стабільным, а цэны на нафту і газ з Расіяй ужо вызначаны — таму я не бачу нейкіх знешніх пагроз для Беларусі.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

У ЧАШНІЦКІМ РАЁНЕ МІНЧАНІН ПАДСТРЭЛІЎ СЯБЕ НА ПАЛЯВАННІ

У выніку няшчаснага выпадку на паляванні ў Чашніцкім раёне агнястрэльнае раненне атрымаў 36-гадовы мінчанін, работнік аднаго са сталічных прадпрыемстваў, паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама.

Няўдачлівы паляўнічы быў дастаўлены ў нядзелю вечарам у Новалукомльскую цэнтральную раённую бальніцу (ЦРБ) з дыягназам агнястрэльнае навылётнае раненне левага перадплечча і пляча з пашкоджаннем сасудаў і мышцаў. У ходзе праверкі супрацоўнікі Чашніцкага РАУС высветлілі, што жыхар Мінска падстрэліў сам сябе ў лесе каля вёскі Барсукі. Палюючы на зайца, ён спатыкнуўся, і пры падзенні адбыўся самаадвольны выстрал з ружжа Іж-58 12-га калібру.

Сяргей КОЧАТАЎ, БЕЛТА.

ПАДАЗРОНЫЯ Ў ЗАБОЙСТВЕ ВАДЗІЦЕЛЯ ТАКСІ ЗАТРЫМАНЫ Ў САЛІГОРСКУ

У Салігорску затрыманы падазроныя ў забойстве вадзіцеля таксі, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА оперупаўнаважаны па асабліва важных справах упраўлення крымінальнага вышуку галоўнага ўпраўлення крымінальнай міліцыі МУС Беларусі Уладлена Харытонава.

Паводле яе інфармацыі, супрацоўнікі крымінальнага вышуку Салігорскага РАУС у ходзе правядзення мерапрыемстваў па вышуку без вестак прапаўшага вадзіцеля ТДА «Рэм» знайшлі яго труп у лясным масіве паблізу вёскі Язавінь з колатымі ранамі ў вобласці сэрца і шыі. Паводле заключэння судова-медыцынскай экспертызы, смерць наступіла ад механічнай асфіксіі.

Следствам устаноўлена, што забойства ўчынілі два мясцовыя жыхары, адзін з якіх раней судзімы за хуліганства. Таксіста задушылі недалёка ад пасёлка Заазёрны, завалодалі аўтамашынай «Фольксваген» і ўцяклі.

Во даюць!

УЦЕКАЧЫ ШТУРМАВАЛІ РЭКІ...

Каля васьмі гадзін праваахоўнікам давялося праследаваць злачынцаў, якія ўчынілі ўзброены напад і разрабавалі касу аўтазаправачнай станцыі.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік Крупскага РАУС Міхаіл Сацук, каля а паловы другой ночы ў дзяжурную часць міліцыі паступіла трывожнае паведамленне ад аператара АЗС, што размешчана паблізу вёскі Пліса: некалькі хвілін таму двое невядомых у масках, разбіўшы бітай акно станцыі, праніклі ў памяшканне і пад пагрозай пісталета выкралі з касы каля 4 мільёнаў беларускіх рублёў, больш за 11 тысяч расійскіх рублёў, больш за 730 долараў ЗША і 460 еўра. Супрацоўнікі следчай групы, якія аператыўна прыбылі на месца злачынства, не далі крымінальнікам замесці сляды і было арганізавана праследаванне рабаўнікоў. Быў падняты на трывогу асабовы склад РУУС: раён, у якім, як меркавалася, павінны знаходзіцца злачынцы, праваахоўнікі блакіравалі. Між іншым, уцекачы, спрабуючы адарвацца ад супрацоўнікаў міліцыі, пяць разоў перасякалі па вадзе раку Пліса і раз — Бобр. Аднак у рэшце рэшт крымінальнікі апынуліся ў пастцы і былі затрыманы. Ад пісталета злачынцы паспелі пазбавіцца, адзін з іх — і ад часткі нарабаванага. Апошняму, дарэчы, давялося разам з праваахоўнікамі паўтарыць маршрут уцёкаў і паказаць месца, дзе ён скінуў грошы. Як высветлілася, злачынства ўчынілі двое раней судзімых — жыхар вёскі Марцюхова Талачынскага раёна і жыхар Талачына.

Ігар ГРЫШЫН.

КАШТОЎНАСЦІ ЗНІКЛІ З ВІТРЫНЫ

У Мінску праваахоўнікі вышукваюць злачынцу, якому ўдалося незаўважна «падчысціць» вітрыну ювелірнага магазіна.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, здарэнне адбылося ў магазіне на вуліцы Куйбышава: тут у прамежак часу з дзесяці гадзін раніцы да пяці вечара з адной з вітрын зніклі ўпрыгажэнні. Як высветлілася, невядомы зрабіў «ювелірную работу — яму ўдалося падабраць ключ да замка вітрыны і выкрасці адтуль 3 залатыя бранслеты. Між іншым, кошт зніклых каштоўнасцяў ацэньваецца ў агульную суму 23 мільёны 802 тысячы рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

З ГАРЫШЧА — У СКЛЕП...

44-гадовага жыхара вёскі Навасады Барысаўскага раёна сілком у 11 гадзін вечара выцягнулі з дому, звязалі і кінулі ў гружавую павозку: вызваліўся няшчасны з-пад «апекі» зламысніка толькі на наступны дзень...

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-афіцэр Барысаўскага РАУС Андрэй Шутко, падазраюцца ва ўчыненні гэтага злачынства чацвёра жыхароў вёскі Зорычы. Гэты «квартэт» пранік у чужое жыллё праз акно: няпрошаныя візіцёры адшукалі гаспадара на гарышчы, адкуль яго прымусова і даставілі «пад канвоем» у вёску Зорычы. На месцы, змясціўшы сваю ахвяру ў склеп закінутага дома, зладзеі збівалі няшчаснага — хто нагамі, хто рукамі, ды і рукаяткай ад сякеры пацярпеламу таксама перапала. Аб сваіх ліхіх прыгодах пацярпелы на наступны дзень паведаміў у міліцыю, супрацоўнікі якой затрымалі і змясцілі ў ізалятар часовага ўтрымання крыўдзіцеляў заяўніка. Паводле папярэдняй інфармацыі, не выключана, што мужчына перажыў не самыя прыемныя гадзіны ў сваім жыцці... з-за рэўнасці.

Ігар ГРЫШЫН.

СХАПІЎ І ДАЎ ДЗЁРУ

Што прымусіла пайсці на адкрыты грабеж 34-гадовага вартаўніка адной з будаўнічых арганізацый горада Рэчыцы (дарэчы, раней судзімага), цяжка сказаць. Толькі вядома, што ён, зазірнуўшы на рынак Гомеля, схапіў з прылаўка індывідуальнага прадпрымальніка карабок з грашыма — у ім было паўтара мільёна рублёў — і даў дзёру. Нядоўга, праўда, гулялася яму бесклапотна. Бо міліцыя хутка паставіла, як паведамілі нам у прэс-цэнтры УУС Гомельскага аблвыканкама, усё на сваё месца.

А вось пра крадзеж з крамы індывідуальнага прадпрымальніка з горада Рагачова гэтага пакуль не скажаш. Ён не паклапаціўся аб ахоўнай сігналізацыі, што скарыстаў невядомы. У выніку зніклі 32 апараты сотавай сувязі і дзесяць сім-карт на суму больш за 10 мільёнаў рублёў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

З жыцця кантрабантыстаў

Бялізна ад Евы

Буйныя партыі кантрабанднага адзення выявілі апошнім часам беларускія памежнікі.

Паводле звестак цэнтра інфармацыі і грамадскіх сувязяў органаў памежнай службы, у пункце пропуску «Новая Гута», што на беларуска-ўкраінскай мяжы, падчас афармлення мікрааўтобуса быў знойдзены цэлы склад жаночай бялізны, спадніц, кофтаў. Кантрабандны груз агульным коштам амаль 11 мільёнаў рублёў выявіла службовая сабака па мянушцы Ева.

Яшчэ дзве буйныя партыі кантрабанднага адзення былі днямі знойдзены ў цягніках. Падчас афармлення цягніка «Вільнюс—Масква» памежным нарадам у тамбуры быў выяўлены тайнік, дзе захоўвалася амаль 200 жаночых блузак агульным коштам каля 9,5 мільёна рублёў. Гаспадары тавару так і не аб'явіліся.

А вось у цягніку «Гродна—Масква» мытнікі сумесна з міліцыянерамі рассакрэцілі цэлую групу кантрабандыстаў. Імі аказаліся праваднікі, якія незаконна ўвезлі ў нашу краіну з Польшчы больш за 300 вырабаў жаночага адзення агульным коштам прыкладна 16,5 мільёна рублёў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

«Мабільны» бак

Жыхар Гродна зрабіў у сваім аўтамабілі «Ford» хітры тайнік для правозу кантрабанды...

Як паведамілі ў цэнтры інфармацыі і грамадскіх сувязяў органаў пагранслужбы, кантрабандыст спрабаваў увезці з Польшчы амаль 150 мабільнікаў і аксесуараў для іх, а таксама прыстасаванні для ўкладкі плітак. Усю кантрабанду ён схаваў у паліўным баку. Аднак памежнікі рассакрэцілі тайнік і цяпер няўдаламу кантрабандысту давядзецца развітацца не толькі з таварам, коштам каля 23 мільёнаў рублёў, але і з аўтамабілем, які ацэнены ў 7 мільёнаў рублёў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

На гэтым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

29 студзеня — вучоны сакратар НДІ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі Наталля Аляксандраўна АРЦЁМАВА.

30 студзеня — намеснік дырэктара Беларускага цэнтра медыцынскіх тэхналогій Ірына Уладзіміраўна МАЛАХАВА.

У графіку магчымыя змяненні.

«Гарачая» лінія Упраўлення аховы здароўя Мінскага аблвыканкама (017) 220 20 25

29 студзеня:

9.00—12.00 — галоўны спецыяліст упраўлення аховы здароўя па анкалогіі Святлана Мікалаеўна СІРЭНКА.

14.00—17.00 — галоўны хірург упраўлення аховы здароўя Анатоль Аркадзьевіч МАРЫНІЧ.

Прашу слова

Рэкамендацыя для абітурыентаў — гэта «ахоўная грамата» для эліты

Вельмі ўважліва прачытаў артыкул Надзеі Нікалаевай «Празрыстасць прыёмнай кампаніі не павінна ставіцца пад сумненне», змешчаны ў «Звяздзе» за 19 снежня. І вырашыў выказаць уласныя меркаванні наконт плануемых змяненняў у Правілы прыёму. Мне, як педагогу-ветэрану і бацьку, тры дачкі якога паспяхова скончылі сталічныя ВНУ, а ў мінулым годзе і ўнучка стала студэнткай медыцынскага ўніверсітэта, ёсць што расказаць і чым падзяліцца. Хоць бы па той прычыне, што праблемы паступлення добра ведаю на ўласным вопыце.

Журналістка без эмоцый, лагічна і разумна выказалася наконт намеру ўвесці пры паступленні на некаторыя спецыяльнасці рэкамендацыі, якія стануць допускам да ўдзелу ў конкурсе. Не магу не выказаць сваю незадаволенасць тым, што многія новаўвядзенні рыхтуюцца без ведама і ўдзелу грамадскасці, у вузкім коле чыноўнікаў, а затым падаюць нам, як той снег на галаву. На мой погляд, з увядзеннем цэнтралізаванага тэсціравання мы закрылі адну з крыніц хабарніцтва, блату і ліквідавалі магчымасць трапіць у вышэйшыя навучальныя ўстановы, так бы мовіць, з чорнага ходу. Усе абітурыенты былі пастаўлены ў роўныя ўмовы, незалежна ад таўшчыні бацькоўскага кашалька ці «вышыні» займаемай іх бацькамі пасады. І за гэта тэсціраванне трэба толькі вітаць, усімі сродкамі яго абараняць і не дапускаць ніякіх новаўвядзенняў у Правілы прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Але мы, відаць па ўсім, ніяк не можам абысціся без стварэння «пралазаў». Вось і прыдумалі атрыманне абітурыентамі рэкамендацый, якія дазволяць «эліце» ўдзельнічаць у «сваім» конкурсе. І нават вызначылі навучальныя ўстановы і спецыяльнасці, куды дарога будзе адкрыта толькі абітурыентам з «ахоўнаю граматаю». Дзіўна і нават неверагодна, што дадумаліся да гэтага ў наш час! Мы ж можам такім чынам «праславіцца» на ўвесь цывілізаваны свет.

Ну няўжо чыноўнікі з мясцовых ці раённых органаў улады, якім мяркуецца даверыць права выдаваць абітурыентам рэкамендацыі для паступлення, змогуць за некалькі хвілін ці нават гадзіну беспамылкова ацаніць юнака ці дзяўчыну і вызначыць іх будучыню. А можа яны ведаюць дзяцей лепш за іх педагогаў?

Мяне здзівіў і пералік спецыяльнасцяў, на якіх ад абітурыентаў будуць патрабаваць прадастаўленне рэкамендацыі. Атрымліваецца, што педагогам ці медыкам, як і многім іншым спецыялістам, яны непатрэбныя, а вось журналістам, эканамістам, мытнікам без рэкамендацый — ну ніяк не абысціся. Пагадзіцеся, паважаныя чытачы, што тут няма аніякай логікі. Ну а калі і ёсць, то няхай нам усім яе патлумачаць, прычым так, каб кожны зразумеў сур'ёзнасць падстаў для прыняцця вельмі непапулярнага рашэння. Вельмі хацелася б пачуць тлумачэнні ад аўтараў гэтай надуманай і нічым не абгрунтаванай прапановы.

На мой погляд, прыкрывацца такімі высакароднымі матывамі, як прафарыентацыя, недапушчальна. Ніхто, зразумела, не супраць прафарыентацыйнай работы са школьнікамі, і яна па магчымасці правадзіцца. Пэўна, недастаткова. Дык чаму б яе не падштурхнуць, чаму б не арганізаваць на радыё, тэлебачанні, старонках газет ці ў школах сустрэчы са спецыялістамі?

Увогуле такія сур'ёзныя змяненні ў Правілы прыёму трэба было спакойна і грунтоўна абмеркаваць і ўзважыць, запрасіўшы да абмеркавання ўсіх ахвотнікаў, і толькі пасля гэтага вырашаць, уводзіць іх ці адхіліць. Баюся, што новаўвядзенне будзе зацверджана, бо ніхто з чыноўнікаў не рызыкне выступіць супраць. Але, магчыма, яшчэ не позна ад яго адмовіцца? Вельмі добра паступіла «Звязда», што ўзняла гэтае пытанне на сваіх старонках. На жаль, але ў сваім прафесійным выданні я не знайшоў абмеркавання гэтага лёсавызначальнага дакумента...

Іван ГОВАР, ветэран педагагічнай працы, *г. Ўе.*

Супрацоўнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне галоўнаму спецыялісту аддзела па рабоце з дакументамі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Сінькевіч Маргарыце Уладзіміраўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ПАКІСТАНЕ БАЕВІКІ ЎЗЯЛІ Ў ЗАКЛАДНІКІ ШКОЛЬНІКАЎ

Група баевікоў узяла ў закладнікі каля 250 школьнікаў на паўночным захадзе Пакістана. Інцыдэнт адбыўся ў вёсцы Дамейль каля горада Карак.

Паводле слоў міністра ўнутраных спраў Пакістана Хаміда Навааза, сем баевікоў утрымлівалі ў закладніках ад 200 да 250 чалавек. У той жа час сведкі адзначалі, што баевікоў было больш — да 15 чалавек. Будынак школы для хлопчыкаў, дзе засялі баевікі, быў узяты ў кольца паліцыяй і сіламі бяспекі. Са злачынцамі вяліся перамовы. Пасля таго, як да дыялогу далучыліся племянныя старэйшыны, паліцыя прадаставіла злачынцам бяспечны праход у абмен на вызваленне закладнікаў. Як аказалася, школу захапілі не баевікі, а звычайныя злачынцы пасля няўдалай спробы выкрадання чалавека.

УСЁ МЕНШ НАРВЕЖЦАЎ ХОЧУЦЬ УСТУПЛЕННЯ Ў ЕС

Рэкордная колькасць жыхароў Нарвегіі выказалася супраць уступлення краіны ў Еўрапейскі саюз. Пра гэта сведчаць вынікі апытання грамадскай думкі, якое ў панядзелак абнародавала Нарвежскае дзяржаўнае радыёвяшчанне.

Згодна з вынікамі апытання 54,3 працэнта насельніцтва краіны не хочуць далучацца да Еўрасаюза. Супрацьлеглага меркавання прытрымліваюцца 34,6 працэнта нарвежцаў. Такім чынам, жыхары паўночнага каралеўства зноў рашуча выказаліся супраць членства краіны ў ЕС, прычым з кожным годам колькасць праціўнікаў такога кроку расце. Адзначым, што акрамя Нарвегіі, у Еўрапейскі саюз катэгарычна адмаўляецца ўступаць Швейцарыя.

РАСІЙСКІ ІНСТЫТУТ ПРАВЕРЫЦЬ ЗАХАД НА ВЫКАНАННЕ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

У Расіі створаны «Інстытут дэмакратыі і супрацоўніцтва», аднымі з галоўных задач якога стануць распаўсюджванне пазітыўнага вобразу Расіі за мяжой, крытыка стану дэмакратыі ў ЗША і Еўропе, а таксама данясенне да Захаду пункту гледжання кіраўніцтва Расіі на ўнутраныя і знешнія палітычныя працэсы.

КРЫМСКІЯ КАМУНІСТЫ ГАТОВЫЯ ДАЛУЧЫЦЬ ПАЎВОСТРАЎ ДА САЮЗА БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Крымская аўтаномія можа ініцыяваць падпісанне саюзнага дагавора з Расіяй і Беларуссю ў адказ на палітыку ўкраінізацыі, якую праводзіць афіцыйны Кіеў. Пра гэта заявіў адзін з лідараў Кампартыі Украіны ў Крыме Вячаслаў Захараў.

АБЯЦАННЯМ СААКАШВІЛІ ВЕРАЦЬ МЕНШ ЗА ТРЭЦЬ ГРАМАДЗЯН ГРУЗІІ

Толькі 27,3 працэнта грамадзян Грузіі вераць у тое, што новаабраны прэзідэнт краіны Міхаіл Саакашвілі выканае свае перадвыбарныя абяцанні. Пра гэта сведчыць сацапытанне, праведзенае штодзённікам «Квірыс палітра».

45 працэнтаў апытаных газетай прызналіся, што не вераць у абяцанні Саакашвілі, а 27,7 працэнта не змаглі ўпэўнена адказаць на пытанне.

Палеміка

Who is Mr МЯДЗВЕДЗЕЎ?

Як могуць змяніцца адносіны Беларусі і Расіі пасля выбараў прэзідэнта ў апошняй?

Адразу пасля абрання Уладзіміра Пуціна прэзідэнтам Расіі, многія заходнія журналісты і палітыкі сталі задавацца пытаннем: «Who is Mr Пуцін?» — «Хто ёсць містэр Пуцін?» Падставай для такога пытання стала мінулае спадара Пуціна, звязанае з савецкімі спецслужбамі, а таксама жаданне новага лідара наладжваць цесныя адносіны з Захадам.

Прыкладна праз два месяцы пасаду кіраўніка Расіі зойме новы чалавек. Ніхто з назіральнікаў не сумняваецца, што перамогу на выбарах атрымае першы віцэ-прэм'ер Дзмітрый Мядзведзеў. Менавіта яго Уладзімір Пуцін назваў сваім пераемнікам. І сёння самы час задацца пытаннем: «Who is Mr Мядзведзеў?»

На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказваюць беларускі палітолаг Юрый Шаўцоў і старшыня Камісіі па інфармацыйнай палітыцы Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі Мікалай Дубовік.

Юрый ШАЎЦОЎ:

«Ёсць верагоднасць, што Мядзведзеў пойдзе на паляпшэнне адносінаў»

— У сучаснай Расіі мы бачым ужо другі раз прызначэнне прэзідэнтам свайго пераемніка. Спачатку Барыс Ельцын назваў ім Пуціна, цяпер Пуцін — Мядзведзева. Як вы ацэньваеце такую працэдуру?

— У гэтай сітуацыі ёсць галоўны станоўчы момант — Расія выйшла з хаоса, у якім была ў 1990-я гады. І для Беларусі як краіны суседняй і саюзнай Расіі, гэта, у прынцыпе, добра. Што да дзіўнаватага механізму захавання гэтай стабільнасці... Яго складана назваць паслядоўна дэмакратычным. Але лепш так, чым выбухі ў сталіцы ці захопы закладнікаў. Чым усё тое, што мы бачылі ў 1990-я.

— У сітуацыі, калі Дзмітрый Мядзведзеў становіцца прэзідэнтам, а Уладзімір Пуцін — прэм'ер-міністрам, хто з іх будзе больш уплывовым пры прыняцці важных палітычных і эканамічных рашэнняў?

— Думаю, Пуцін. Бо Мядзведзеў атрымлівае ўладу з яго рук. І Пуцін — гэта не хворы Ельцын. Таму Мядзведзеву будзе складана напрацаваць свой аўтарытэт пры такім моцным палітыку, як Пуцін.

У Расіі зараз няма кантрасту, які быў падчас перадачы ўлады Пуціну ад Ельцына. Пуцін атрымаў краіну фактычна разваленай. На яе перыферыі ішла грамадзянская вайна. А потым рост цэнаў на нафту даў Пуціну грошы і магчымасць вырашыць усе злабадзённыя праблемы. У Мядзведзева ж такога кантрасту няма. Таму, думаю, працяглы час Пуцін будзе заставацца больш важным палітыкам.

З іншага боку, зараз адбываецца не проста перадача ўлады ад аднаго лідара іншаму. Адбываецца структурная перабудова ўсёй палітычнай сістэмы Расіі. І больш важным у гэтай перабудове ёсць не перадача ўлады Мядзведзеву, а выбары ў Дзярждуму. Упершыню Расія мае чыста партыйную Думу. Гэта значыць, што ўнутры Расіі пачынаюць мець вялікую вагу ідэалагічныя адрозненні. І набывае вагу партыйны апарат, як механізм уплыву Думы, цэнтра на рэгіёны.

І калі Пуцін, які з'яўляецца рэальным лідарам сённяшняй Думы, стане яшчэ і прэм'ер-міністрам, то, значыць, дэ-факта адбылася вельмі моцная ператасоўка ўладных паўнамоцтваў. Прэзідэнт аб'ектыўна будзе мець менш вагі, чым раней.

— Як могуць змяніцца адносіны Беларусі і Расіі пасля выбараў?

— Кожны новы прэзідэнт мае карт-бланш на непапулярныя меры. На працягу першых паўгода—паўтара года. Таму з гэтага пункту погляду можна было б чакаць ад Мядзведзева нейкіх негатыўных для нас крокаў.

З іншага боку, Расія апынулася ў вельмі складаным знешнепалітычнай сітуацыі. Настолькі складанай, што нейкага дыпламатычнага вырашэння праблемы не бачна. Таму, не выключана, гэта дасць магчымасць Мядзведзеву нейкім чынам інтэнсіфікаваць адносіны з Беларуссю.

Я разлічваў бы на апошні варыянт. Ёсць верагоднасць, што Мядзведзеў пойдзе на паляпшэнне адносінаў. І, можа, нават на аднаўленне працэсу інтэграцыі ў рамках Саюзнай дзяржавы. Але не вельмі глыбокага.

— Пад складанай знешнепалітычнай сітуацыяй, у якой апынулася Расія, вы мяркуеце на ўвазе яе адносіны з Захадам?

— Так, у першую чаргу іх. І гэтыя складаныя адносіны будуць нарастаць. Чаму? Па-першае, Еўрасаюз з 2009 года павінен атрымаць супольную знешнюю палітыку і яе інстытуты. Па-другое, у ЗША пасля выбараў новы прэзідэнт будзе мець магчымасць для больш рэзкіх дзеянняў. Па той жа логіцы, што і ў сітуацыі з Мядзведзевым. І гэтыя дзеянні ЗША будуць накіраваны на памяншэнне вагі Расіі ў свеце.

— Якія сёння плюсы і мінусы Саюзнай дзяржавы для Расіі?

— Тыя ж, што і былі заўсёды. Мы сапраўды для Расіі «акно ў Еўропу». Усе размовы правесці ў абход нас трубаправоды так і засталіся размовамі. Хоць яны вядуцца ўвесь час, як Пуцін з'яўляецца прэзідэнтам. Больш за тое, аб'ём транзіту праз нас звычайных грузаў значна павялічыўся.

Акрамя таго, у вайсковым плане мы сталі зараз для Расіі значна больш важнымі, чым былі раней. Зараз ужо няма ніякіх ілюзій наконт супрацоўніцтва Расіі з НАТО. І Расія павінна рыхтавацца да буйнога крызісу вакол інтэграцыі Украіны ў НАТО. У гэтым кантэксце роля Беларусі больш важная, чым раней.

— Апошнім часам расійская прэса актыўна абмяркоўвала варыянт, пры якім Уладзімір Пуцін станавіўся б кіраўніком Саюзнай дзяржавы. Такім чынам ён працягваў бы свае паўнамоцтвы. Як вы ацэньваеце такі варыянт на перспектыву?

— Ён зараз больш рэальны, чым быў нядаўна. Калі Пуцін пасля прэзідэнцкіх выбараў стане кіраўніком Саюзнай дзяржавы, то гэта не будзе нейкім чынам біць па суверэнітэце Расіі. А з пункту погляду прыцягнення расійскай і міжнароднай увагі да Саюзнай дзяржавы гэта спрацавала б на плюс. Аднак гэта вельмі тэарэтычна.

Мікалай ДУБОВІК:

«Мяне вельмі непакоіць, што будзе з Саюзнай дзяржавай»



— Як вы ставіцеся да практыкі прызначэння пераемнікаў прэзідэнтамі Расіі?

— Я падтрымліваю яе. Бо не варта абіраць прэзідэнта на два скліканні і пасля гэтага змяняць увесь курс... Пуціну ўдалося стварыць механізм, па якім будзе развівацца Расія. І пасля гэтага прыходзіць час яго сыходу ў адстаўку. Хоць усе цудоўна разумеюць, што ён на гэтай пасадзе мог бы зрабіць значна больш, маючы добры вопыт за плячыма, чым той, хто будзе пачынаць з нуля. Я магу аб гэтым разважаць па сабе, як дэпутат. Першае скліканне дэпутат, звычайна, вучыцца. Другое скліканне — працуе. І з кожным годам яму лягчэй вырашаць пытанні.

Я падтрымліваю прызначэнне пераемніка яшчэ і таму, што кожны грамадзянін Расіі ведае, што яго не чакаюць такія катаклізмы, як у Грузіі, ва Украіне. Гэта прадказальны шлях. Чалавек можа спакойна жыць ранейшым жыццём, ведаючы, што яго чакае наперадзе.

І расіяне падтрымліваюць Мядзведзева ў першую чаргу таму, што яго падтрымлівае Пуцін. Мядзведзеву будзе лёгка перамагчы на выбарах. Бо на яго будзе працаваць не ўласны аўтарытэт, а аўтарытэт Пуціна.

— У выпадку, калі Мядзведзеў стане прэзідэнтам, а Пуцін зойме пасаду прэм'ер-міністра, хто з іх будзе больш уплывовым пры прыняцці рашэнняў?

— Гэтае пытанне ўзнікла ў мяне адразу пасля таго, як я пачуў інфармацыю ў СМІ пра дадзеную раскладку. І я ўпэўнены, што асноўныя рашэнні будзе прымаць Пуцін. Верагодна, гэта будзе своеасаблівы «англійскі варыянт» — калі каралева мае прадстаўнічыя функцыі, а прэм'ер-міністр валодае ўладай.

У той жа час тут ёсць іншы момант. Калі б Пуцін ішоў у пары, напрыклад, з Зубковым, то «англійскі варыянт» быў бы лёгкім. А Пуцін ідзе ў пары з амбіцыйным Мядзведзевым. І можа прайсці невялікі прамежак часу, як Мядзведзеў пажадае ісці самастойным шляхам.

— 2008 год пачаўся без традыцыйнага скандалу Беларусі з «Газпрамам». Ці можна меркаваць, што Крэмль вырашыў не прыцягваць увагі да кампаніі, кіраўніком савета дырэктараў якой з'яўляецца Дзмітрый Мядзведзеў?

— У палітыцы заўсёды ўсё пралічваецца да дробязяў. І я ўпэўнены, што такі варыянт пралічваўся расійскім бокам. Пры гэтым у папярэднія гады пазіцыя Мядзведзева па газавым пытанні была больш жорсткая. Сёлета ж удалося знайсці агульныя кропкі судакранання.

Сёння, дарэчы, варта задумацца, што будзе з газавым пытаннем пасля абрання Мядзведзева на пасаду кіраўніка Расіі. Бо ў апошнія гады ён і ўрад адыгрываў немалую ролю ў тым, што Беларусь сутыкалася з праблемамі ў цэнах на газ. Расійскі ўрад займаў у дачыненні да нас жорсткую пазіцыю. Таму, на маю думку, пасля абрання Мядзведзева нам не стане прасцей вырашаць энергетычныя пытанні.

Больш за тое, мяне турбуе, як знойдуць агульную мову вопытны і напорысты Аляксандр Лукашэнка і малады, амбіцыйны і сучасны Мядзведзеў. Бо шлях развіцця Беларусі больш сацыяльны. Мы спачатку думаем пра чалавека, а потым пра эканоміку. У Расіі ж сёння, на мой погляд, у першую чаргу ідзе вырашэнне эканамічных пытанняў. А потым ужо — чалавек.

— Як вы ацэньваеце развіццё Саюзнай дзяржавы пры Пуціне? Ці можна сказаць, што ўплыў, напрыклад, Парламенцкага сходу Саюзнай дзяржавы звёўся амаль да нуля?

— Пры Ельцыне мы зрабілі значна больш, чым пры Пуціне. Нягледзячы на тое, што тады ва ўрадзе быў Нямцоў і многія іншыя з тых, хто не падтрымліваў гэты напрамак. А пры Пуціне Саюзная дзяржава стаяла на месцы. Мы больш дэкларавалі, чым рабілі.

І мяне вельмі непакоіць, што будзе з Саюзнай дзяржавай пасля таго, як кіраўніком Расіі стане Мядзведзеў. Бо раней, паводле маіх назіранняў, ён не быў вялікім прыхільнікам хуткіх тэмпаў будаўніцтва гэтай дзяржавы.

***— Многія расійскія журналісты выказваюць меркаванне, што Пуцін пасля абрання прэм'ер-міністрам можа за

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287-17-41

«Ільготы для неабгрунтавана высланых у перыяд рэпрэсій не прадугледжаны»

Сям'я Валянціны Іванаўны Кончык (у дзявоцтве Назарчук) з вёскі Вялікія Краглі Дзятлаўскага раёна ў 1939 годзе была рэпрэсавана. З гэтай нагоды заяўніца раней, паводле яе слоў, карысталася пэўнымі льготамі, напрыклад, на аплату электраэнергіі, паліва.

— А якія льготы захаваліся для такіх людзей зараз, у сувязі з адменай з 17 снежня мінулага года льготаў для асобных катэгорый грамадзян? Трапілі мы ў той пералік ці не? Дачка па маёй просьбе хадзіла ў райсабес, але высветлілася, што патрэбны спецыяліст зараз адпачывае, — гаварыла Валянціна Іванаўна. — Я пенсіянерка, мне 73 гады. Дарослыя дзеці раз'ехаліся: дочкі жывуць у Гродне і Століне, сын — у Дзятлаве.

Па тлумачэнні рэдакцыя звярнулася да начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Дзятлаўскага райвыканкама Ліліі Васюкевіч. «Так, памянёны спецыяліст зараз у адпачынку, але чаму дачка вашай заяўніцы не звярнулася да мяне, да намеснікаў?»

Па сутнасці ж звароту спецыялістамі ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне быў падрыхтаваны наступны адказ.

«Законам Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2007 года № 239—З «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян» прадастаўленне льготаў грамадзянам, што былі неабгрунтавана прыцягнуты да крымінальнай адказнасці, а таксама асобам, якія былі неабгрунтавана высланы ў перыяд рэпрэсій за межы рэспублікі і ў далейшым рэабілітаваным, не прадугледжана.

У дачыненні да вышэйназваных грамадзян маюцца льготы пры прызначэнні пенсій (па вылічэнні працоўнага стажу і памеру пенсіі) па арт. 51 і 68 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні». Аднак гэтыя льготы распаўсюджваюцца на саміх грамадзян, а не на іх родных».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Кватэрнае пытанне

Калі адзін з сямейнікаў выбыў часова

У 2005 годзе я прыехаў у Магілёў на вучобу. Жыву і прапісаны ў студэнцкім інтэрнаце. Па месцы ранейшай прапіскі жыве брат з сям'ёй, бацькі, нядаўна нарадзіўся ўнук. На аднаго чалавека стала прыпадаць менш як 15 кв. метраў агульнай плошчы, калі лічыць і мяне... Я ж часова выбыў на вучобу? Ці могуць бацькоў паставіць на кватэрны ўлік?

Г.З., *г. Магілёў.*

Згодна з артыкулам 30 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь грамадзяне нашай краіны маюць права свабодна перамяшчацца і выбіраць месца жыхарства ў межах Рэспублікі Беларусь, пакідаць яе і бесперашкодна вяртацца назад. Пры рэалізацыі гэтага права павінна забяспечвацца канстытуцыйна гарантаванае кожнаму грамадзяніну адно з найважнейшых сацыяльна-эканамічных правоў — права на жыллё (артыкулы 21, 29, 48) і, у прыватнасці, захаванне жыллёвых правоў за часова выбыўшымі грамадзянамі па месцы пастаяннага пражывання.

У дадзеным выпадку прапіска па месцы вучобы ў студэнцкім інтэрнаце носіць часовы характар (на перыяд вучобы), і факт пражывання ў гэтым інтэрнаце не з'яўляецца падставай для прыняцця грамадзяніна на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы фактычнага, але часовага пражывання (г.зн. у населеным пункце, дзе знаходзіцца навучальная ўстанова).

У той жа час па месцы пастаяннага жыхарства грамадзяніна (адкуль ён часова выбыў для вучобы) за ім павінны захоўвацца ўсе жыллёвыя і звязаныя з імі правы (незалежна ад наяўнасці прапіскі), такія, як: захаванне права карыстання жыллём або права ўласнасці на яго, захаванне права знаходжання на кватэрным уліку або пастаноўкі на такі ўлік, права атрымання жылога памяшкання або дзяржаўнай падтрымкі для будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылога памяшкання, атрыманне зямельнага ўчастка для індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва, удзелу ў прыватызацыі жылых памяшканняў, раздзеле, абмене іх, у здзелках па адчужэнні жылля і інш.

Указаныя правы за часова выбыўшым з месца пастаяннага жыхарства грамадзянінам (у дадзеным выпадку — для вучобы ў іншым населеным пункце) павінны захоўвацца на ўвесь перыяд вучобы і да атрымання ім жылога памяшкання ў пастаяннае карыстанне (набыцця ва ўласнасць) у іншым населеным пункце.

Такім чынам, часова выбыўшы для вучобы ў іншым населеным пункце грамадзянін павінен улічвацца ў складзе сям'і бацькоў пры вырашэнні пытання аб пастаноўцы гэтай сям'і на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы пастаяннага жыхарства пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных пунктам 3 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прадастаўлення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565). Адмова мясцовага выканаўчага і распарадчага органа ў прыняцці сям'і на кватэрны ўлік можа быць абскарджана ў судовым парадку.

Віктар САВІЦКІ.

Прамая лінія

МАЯ СЯМ'Я:
АД ДАПАМОГІ ДА ЖЫЛЛЯ

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 23—26 студзеня.)

— Ці выдаецца субсідыя маладой сям'і, якая ўзяла няльготны крэдыт?

Галіна Іванаўна, *Уздзенскі раён*

— Калі дом яшчэ не пабудаваны, то разлічваць на субсідыю маладая сям'я, што знаходзіцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, можа. Аднак такая субсідыя выдаецца толькі па чарзе, якую вядзе выканкам. Да таго ж трэба мець на ўвазе, што ў выпадку атрымання субсідыі вам ужо не прадставяць фінансавую дапамогу на пагашэнне няльготнага крэдыту.

— Ці можа разлічваць на льготны будаўнічы крэдыт сям'я з трох чалавек, агульны даход якой (два месцы маёй работы плюс дзіцячая дапамога) складае 1,8—1,9 млн рублёў у месяц? І ці ўлічваецца ў складзе даходу для атрымання такога крэдыту мае падпрацоўкі, дакладней, работа па сумяшчальніцтву?

Антон Іванавіч, *г. Мінск*

— Для атрымання льготнага крэдыту неабходна, каб сукупны даход на кожнага члена сям'і не перавышаў два «сярэднія» мінімальныя спажывецкія бюджэты (ці на сёння — 578 220 рублёў) за 12 папярэдніх месяцаў. Прычым у склад гэтага даходу ўключаюцца і «падпрацоўкі», і дапамогі на дзяцей ва ўзросце да трох гадоў.

— Як шматдзетная сям'я (двое дарослых і шасцёра дзяцей), у свой час мы купілі дом за 84 млн рублёў. Прычым на 70 мільёнаў нам далі льготны, а на 14 мільёнаў — камерцыйны крэдыт. Ільготны крэдыт нам пагасілі, аднак узнікае пытанне: ці маем мы права на якую-небудзь дапамогу ў пагашэнні і няльготнага крэдыту?

Лілія Міхайлаўна ГРАМЫКА, *Шчучынскі раён*

— Права на дапамогу ў пагашэнні камерцыйнага крэдыту ў вас не будзе. Бо Указ № 585 вызначае — скарыстацца такой магчымасцю могуць толькі маладыя сем'і з дзецьмі, якія бралі няльготны, але не карысталіся льготным крэдытам.

— У свой час бацькі мужа запісалі на яго кватэру, і па гэтай прычыне нас не паставілі ў чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў. Тым не менш мы вырашылі будавацца з выкарыстаннем няльготнага крэдыту, таму дазвольце ўдакладніць — ці ёсць у нас, як у маладой сям'і з дзіцем, права на спісанне яго часткі?

Вікторыя, *Вілейскі раён*

— Не. Для атрымання дапамогі ў пагашэнні няльготнага крэдыту неабходна, каб маладая сям'я знаходзілася на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў зараз або на момант заключэння крэдытнага дагавора.

— У 2007 годзе мы ўзялі льготны крэдыт на куплю жылля. Ці маем мы права адначасова, як маладая сям'я з дзіцем, на атрыманне бязвыплатнай субсідыі?

Алена Генадзьеўна КОЎГАН, *Крупскі раён*

— Права на атрыманне субсідыі пры куплі жылля ў маладой сям'і ёсць. Але зноў-такі варта паўтарыцца, што субсідыі выдаюцца ў парадку чаргі, таму з гэтым пытаннем варта звяртацца ў выканкам.

— Спачатку мы купілі невялікі дом, а потым, паколькі нас знялі з чаргі, узялі камерцыйны крэдыт на яго рэканструкцыю. Ці можам мы зараз, як маладая сям'я з дзіцем, разлічваць на пагашэнне часткі такога крэдыту на рэканструкцыю?

Марыя Васільеўна ГУЛІЦКАЯ, *Нясвіжскі раён*

— Увогуле фінансавая падтрымка на пагашэнне няльготных крэдытаў на рэканструкцыю маладым сем'ям прадастаўляецца. Але толькі пры ўмове, што маладая сям'я знаходзілася на ўліку на момант заключэння крэдытнага дагавора або на момант звароту па фінансавую падтрымку.

Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ.

Чаму я чытаю «Звязду»

«Дзякуй, дачка, ты адкрыла для мяне газету!»

Ганна Міхайлаўна ЗАВІШАВА, вёска Дашкаўка Магілёўскага раёна, працуе ў школе псіхолагам, падпісчыца з больш чым 15-гадовым стажам:

— Так, я даволі даўно выпісваю «Звязду», гэта мая любімая газета. Больш за тое, у свой час «падсадзіла» на яе свёкра і свякроў — як на «наркотык» *(смяецца).* Памятаю, мы тады жылі ў Кіраўскім раёне, чытаць неяк асабліва не было чаго. І вось аднойчы, калі да нас зайшла паштарка, я ёй кажу: а выпішы ты «Звязду» і вось на такі адрас, г.зн. для свёкра і свекрыві. Свёкру газета вельмі спадабалася *(смяецца)*, праз нейкі час кажа: выпішы зноў! Праз год і сваіх бацькоў угаварыла, бацька дык літаральна «падсеў» на яе, сказаў неяк: «Дзякуй, дачка, ты адкрыла для мяне газету!» Шчыра скажу, было вельмі прыемна. Дарэчы, вось вам і загаловак — напішыце, калі ласка *(смяецца).* Сёлета бацькі вырашылі «зэканоміць» (а ў нас неяк не выпала ім дапамагчы), выпісалі толькі «раёнку». Дык зараз шкадуюць так! У адным з нумароў вы пісалі пра зямлячку бацькі, яго сяброўку па школе, дык, калі прывезла і паказала яму газету, той адразу сказаў: давай выпішам «Звязду»!

Што падабаецца ў газеце? Найперш, як падаецца палітыка — не лезе нахабна ў рот *(смяецца).* Я гісторык па адукацыі, хоць і працую часова псіхолагам, дык лічу, што ў кожнага свой погляд, таму правільна, што вы падаяце тыя ці іншыя падзеі як факт. А кожны ўжо вольны на ўласны густ іх трактаваць. Не варта літаральна думкі ў галаву ўкладваць! *(Смяецца.)* Укладка «Чырвоная змена» карысная, цікавая: пра тэсціраванне, пра паступленне можна дзецям прачытаць. Рубрыка «Гарачы тэлефон»: задаў пытанне — атрымаў адказ. Сяргей Грыб нядрэнна піша, з цікавасцю заўсёды чытаем Валянціну Доўнар, Крука. Свёкар жыве з намі, дык з дзедам, а яму 83 гады, часта артыкулы апошняга абмяркоўваем, спрачаемся, бо дзед не з усім згодны, местачковыя нейкія прыклады даводзіць, маўляў, у нас не так. Але выразкі публікацый збірае. У нас увогуле амаль уся сям'я цікавіцца газетай, кожны знаходзіць матэрыялы на свой густ: і я, і муж, і свёкар, і дзеці-студэнты, калі прыязджаюць.

Вельмі спадабалася, калі некалькі нумароў «Звязды» выйшлі на крэйдаванай паперы! Сэрца крывёй аблівалася, думала ўсё, чаму ж толькі я адна ў Дашкаўцы «Звязду» выпісваю!? Думаю пра паштарку: вы ж прайдзіцеся па вёсцы, пакажыце гэты нумар людзям, маўляў, якая газета!.. Гэта ж і паштавікам дадатковая рэклама, каб падпіска ў іх павялічвалася... Асобнае дзякуй вам за цудоўныя, прыгожыя календары на гэты год: і пасяўны, і святаў, і месяцавы...

Што не падабаецца або не зусім задавальняе? Не задавальняе, што як псіхолаг асабліва нічога не магу выкарыстаць у вучэбнай практыцы, калі браць адпаведную рубрыку ў газеце. Апошні артыкул: калі ўсё дрэнна, нават у гэтым выпадку трэба шукаць нешта добрае. Шмат «вады», ніякай канкрэтыкі. Бываюць не вельмі ўдалыя нумары, дзе ТБ-праграма, рэклама нейкага прадпрыемства, «Чырвоная змена», што састарэлым людзям не зусім ці цалкам не цікава і — усё, больш чытаць няма чаго. Свёкар адкрые і закрые газету: ужо, кажа, прачытаў.

Не хапае нейкіх, на мой погляд, гістарычных матэрыялаў, нарысаў. Прычым, не навуковых, а папулярных: пра мястэчкі, гарады — адкуль назва пайшла, легенды якія, гісторыя.

А ўвогуле газета вельмі падабаецца, мяняць на якую іншую *(смяецца)* не збіраюся!

Навіны сталіцы

● У Мінску камерцыйныя кіёскі, якія функцыянуюць на прыпыначных пунктах, у гэтым годзе спыняць сваю работу. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў намеснік старшыні Мінгарвыканкама Алег Табанюхоў. Што датычыцца кіёскаў, якія рэалізуюць білетную і друкаваную прадукцыю, то яны застануцца на прыпынках і будуць мадэрнізаваны ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі.

● Прадпрыемствы грамадскага харчавання Мінска знізілі нацэнкі на імпартную алкагольную прадукцыю. Гранічныя нацэнкі на алкагольныя і слабаалкагольныя напоі айчыннай вытворчасці ў разліў (за выключэннем белай гарэлкі ў сувенірным афармленні), што рэалізуюцца ў аб'ектах грамадскага харчавання другой катэгорыі, павялічаны на 20 працэнтаў, а ў першай, вышэйшай і люкс — на 50 працэнтаў. У той жа час на імпартнае спіртное і беларускую белую гарэлку ў сувенірным афармленні гранічныя нацэнкі зніжаны на 50 працэнтаў. «Такім чынам, цэны на гэту прадукцыю сталі роўныя», — падкрэслілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.

Няшчасныя выпадкі ўлічваюцца па-новаму

У сталіцы з пачатку года змяніліся правілы ўліку няшчасных выпадкаў на прадпрыемствах. Зараз іх статыстыка вядзецца па месцы размяшчэння арганізацыі.

Як патлумачыў начальнік Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента дзяржінспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Сяргей Ткачоў, да 2008 года дзейнічала норма, згодна з якой няшчасныя выпадкі ўлічваліся па месцы рэгістрацыі прадпрыемства.

— Гэта было няправільна, неаб'ектыўна, адмоўна адбівалася на агульнай статыстыцы няшчасных выпадкаў, якія здарыліся. Таму і было прынята рашэнне перагледзець нормы іх уліку, — узгадаў спецыяліст. — Напрыклад, летась адбылася трагедыя, калі самалёт з 11 работнікамі прадпрыемства «Трансавіяэкспарт» быў абстраляны ў Самалі. Людзі загінулі, і здарэнне гэтае было ўлічана ў сталічным упраўленні Дэпартамента дзяржінспекцыі працы. Да пачатку 2008 года тут фіксаваліся і няшчасныя выпадкі, якія адбыліся на філіялах мінскіх прадпрыемстваў у іншых рэгіёнах краіны.

За мінулы год Мінскае гарадское ўпраўленне Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы правяло больш за 2600 праверак, па выніках якіх былі выяўлены 23 тысячы парушэнняў адпаведных артыкулаў заканадаўства. Дзве асобы прыцягнуты да крымінальнай адказнасці, 886 чалавек — да адміністрацыйнай, 51 кіраўнік быў звольнены. Кожны другі зварот у дзяржінспекцыю працы быў скаргай работнікаў, якія працуюць у арганізацыях малога прадпрымальніцтва. У асноўным, людзей цікавілі пытанні прытрымлівання працоўнага заканадаўства, выплаты заработнай платы, канчатковыя разлікі.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

Падаткі

ЗАПАЎНЯЦЬ ДЭКЛАРАЦЫЮ ТРЭБА ЎВАЖЛІВА

Сёння наша выданне разам з прэс-цэнтрам Міністэрства па падатках і зборах Беларусі патлумачыць тое, як трэба правільна запаўняць падатковую дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе

Спачатку спынімся на тым, як запаўняецца першы (тытульны) ліст.

У падпункце 2.1 пункта 2 дэкларацыі плацельшчыкам указваюцца звесткі:

— аб дзецях да 18 гадоў. У выпадку, калі асоба перадае дэкларацыю асабіста падатковаму інспектару і мае пры сабе пашпарт, у якім існуюць звесткі аб наяўнасці дзяцей, то грамадзянін указвае звесткі аб іх у дэкларацыі (імя і дату нараджэння) на падставе інфармацыі ў пашпарце, а падатковы інспектар у сваю чаргу робіць запіс «Зверана з пашпартам» і распісваецца. Калі дэкларант накіроўвае дакументы па пошце ці праз даверanую асобу, то ў гэтым падпункце трэба ўказаць імя дзіцяці, дату яго нараджэння, серыю, нумар пасведчання аб нараджэнні, калі і кім яно выдадзена;

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— аб паўналетніх дзецях, якія з'яўляюцца студэнтамі і навучэнцамі дзённай формы навучання і атрымліваюць сярэднюю, першую вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю, у тым ліку і тых, якія навучаюцца за мяжой. Плацельшчык указвае месяц з'яўлення ўтрыманца, назву ўстановы, дзе вучыцца дзіця. У выпадку, калі дэкларанту на працягу года па месцы асноўнай працы прадастаўляліся стандартныя падатковыя вылікі, то фізічная асоба можа не ўказваць дату і нумар даведкі навучальнай установы аб тым, што дзіця пасля 18 гадоў з'яўляецца студэнтам, навучэнцам дзённай формы;

— аб асобах, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў. Указваецца дата выхаду фізічнай асобы ў водпуск па доглядзе дзіцяці. У выпадку, калі фізічнай асобе на працягу года даваліся стандартныя падатковыя вылікі, то дэкларант можа не ўказваць нумар і дату даведкі, якая выдадзена па месцы асноўнай працы аб прадастаўленні ўтрыманцу гэтага водпуску.

Падпункт 3.1 пункта 3 дэкларацыі запаўняюць тыя грамадзяне, якія на працягу 2007 года плацілі за сваё навучанне ва ўстановах адукацыі Беларусі пры атрыманні першай вышэйшай ці сярэдняй спецыяльнай адукацыі або за навучанне мужа (жонкі), сваіх дзяцей, падапечных ва ўстановах адукацыі краіны пры атрыманні імі першай вышэйшай ці сярэдняй спецыяльнай адукацыі, а таксама пагашалі крэдыт (працэнты па крэдыту), пазыку на працягу года, у якім ажыццяўлялася навучанне. У гэтым падпункце ўказваецца прозвішча, імя, імя па бацьку асобы, за якую зроблена аплата, ступень сваяцтва, назва навуковай установы, а таксама сума грашовых сродкаў, якая была накіравана навучальнай установе і (або) крэдытадаўцу лічбамі і прапіссю.

Падпункт 3.2 пункта 3 дэкларацыі запаўняюць тыя асобы, якія знаходзіліся на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у мясцовым выканаўчым і распарадчым органе, іншых дзяржаўных органах і дзяржарганізацыях, арганізацыях недзяржаўнай формы ўласнасці, якія накіравалі на працягу 2007 года грашовыя сродкі на новае будаўніцтва або набыццё на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь індывідуальнага жылога дома ці кватэры, а таксама на пагашэнне крэдытаў (працэнты па іх), атрыманых плацельшчыкам у банках краіны, пазык і якія былі фактычна расходаваны дэкларантам на новае будаўніцтва або набыццё ў Беларусі жылля.

Падпункт 4.1 пункта 4 дэкларацыі запаўняюць тыя фізічныя асобы, якія на працягу 2007 года атрымалі даходы ад платнага адчужэння (у тым ліку шляхам продажу, мены, рэнты) фізічнай асобе больш за адну на працягу 5 гадоў кватэру, жылы дом, дачу, гараж і зямельны ўчастак, якія належалі дэкларанту на праве ўласнасці, ад платнага адчужэння на працягу года аднаго аўтамабіля ці іншага транспартнага сродку, а таксама іншай маёмасці і жадаюць, каб пры падаткаабкладанні гэтых даходаў падатковы орган прадаставіў ім маёмасны вылік у суме фактычна зробленых і дакументальна пацверджаных расходаў, якія звязаны з набыццём і (або) адчужэннем платна адчужаемай маёмасці.

Падпункт 4.2 пункта 4 дэкларацыі запаўняюць тыя, хто летась атрымліваў даходы ад здачы ў арэнду (субарэнду), наём (паднаём) маёмасці, калі даходы атрыманы ад фізічных асобаў у памеры больш за 500 базавых велічынь, ад арганізацый ці індывідуальных прадпрымальнікаў, — у суме фактычна зробленых імі і дакументальна пацверджаных расходаў.

У гэтым падпункце падаткаплацельшчык павінен указаць назву і месца знаходжання памяшкання (напрыклад, аднапакаёвая кватэра № N, змешчаная ў г. Мінску па вул. Рафіева, д. N). Таксама фізічная асоба павінна прыкласці дакументы, якія пацвярджаюць зробленыя расходы.

Падпункт 4.3 пункта 4 дэкларацыі запаўняюць асобы, якія летась атрымлівалі аўтарскія ўзнагароджанні за ўтварэнне, выкананне ці іншае выкарыстанне твораў навукі, літаратуры і мастацтва, узнагароджанні аўтарам вынаходніцтваў, карысных мадэляў, прамысловых узораў і іншых вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці, — у суме фактычна зробленых імі і дакументальна пацверджаных расходаў.

Аднак, калі асоба, якая атрымала ў 2007 годзе аўтарскія ўзнагароджанні па вышэйназваных пунктах, але не мае дакументаў, якія пацвярджаюць зробленыя расходы, то плацельшчык мае права на атрыманне прафесійнага падатковага выліку ў межах вызначанага нарматыву расходаў. Пры гэтым у падпункце 4.3 пункта 4 дэкларацыі кліент павінен зрабіць запіс «не», а ў падпункце 4.4 пункта 4 указаць від аўтарскага ўзнагароджання, напрыклад «Твор літаратуры (артыкул)» і суму даходу.

Вядома, што асноўная маса дэкларантаў наведае падатковую інспекцыю ў лютым. Прыкладна з другой дэкады гэтага месяца МНЗ павялічвае час працы падатковых інспекцый, каб насельніцтва мела магчымасць падаваць дэкларацыі і ў выхадныя дні. Нагадаю, што сёлета падатковую дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе павінны падаць фізічныя асобы, калі на працягу 2007 года яны атрымлівалі абкладаемыя падаходным падаткам даходы з некалькіх крыніц і іх сукупны гадавы даход перавысіў 7 519 992 рублі. Дэкларацыю трэба будзе падаць у падатковыя службы па месцы пастаноўкі на ўлік да 1 сакавіка ўключна.

Сяргей КУРКАЧ.

Супрацоўніцтва

Дом, дзе рады маладым

З намеснікам старшыні Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі (БелТД) Анатолем Шынкевічам гутарыць карэспандэнт «Звязды».

— Анатоль Валянцінавіч, прызнаюся, як удзельнік многіх вашых традыцыйных краіназнаўчых мерапрыемстваў, не перастаю здзіўляцца таму, што ў вялікай зале БелТД часта бачу шмат моладзі. І гэта ў эпоху Інтэрнэту, калі з дапамогай камп'ютара можна адшукаць у глабальнай сетцы разнастайную інфармацыю літаральна аб любой краіне, яе знакамітых палітычных дзеячах, літаратарах, мастаках, навукоўцах. Што вабіць сюды маладых?

— Сапраўды, яны сёння даволі прагматычныя і дарэмна бавіць час не ў іх правілах. На мой погляд, тут уся справа ў матывацыі паводзінаў маладых людзей. Калі ім карысна і цікава — яны ідуць да нас. Няма патрэбы — не зацягнеш.

Думаю, невыпадкова студэнты і вучні старэйшых класаў (асноўная катэгорыя моладзі, якая наведвае нас) называюць наш будынак у цэнтры сталіцы Домам дружбы. Бо акрамя цікавай і разнастайнай інфармацыі, яны тут атрымліваюць дадатковыя веды і, так бы мовіць, праходзяць своеасаблівыя ўніверсітэты сяброўства. Кажу не для прыгожага слова. Да нас не першы год накіроўваюцца на практыку студэнты факультэта міжнародных адносінаў Белдзяржуніверсітэта, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, Міжнароднага гуманітарнага эканамічнага інстытута і іншых ВНУ. Тут у іх выдатная магчымасць праверыць свае здольнасці ў веданні замежных моў, паглыбіцца ў праблематыку той ці іншай краіны.

— Напрыклад?

— Таварыства «Беларусь—Францыя» адносна нядаўна распачала серыю вечароў пад умоўнай назвай «Знаёмства з дэпартаментамі Францыі». Вечары праходзяць на французскай мове, на іх мы запрашаем студэнтаў, якія яе глыбока вывучаюць, прафесійна цікавяцца гэтай краінай. Прысутным аб сваім дэпартаменце расказваюць французы — яго прадстаўнікі. Так летась мы пазнаёміліся з дэпартаментам Ду. У канцы студзеня дэпартамент Луара будуць прадстаўляць таксама французы — члены асацыяцыі Франка-славянскай дружбы.

— Моладзь, заўважыў я, вельмі цэніць асабістыя кантакты, магчымасць атрымаць адказ з першых вуснаў. З гэтым, наколькі я разумею, у Доме дружбы ўсё нармальна?

— Так, нават у эпоху Інтэрнэту і бурнага развіцця інфармацыйных тэхналогій усё ж яны не могуць замяніць і, спадзяюся, ніколі не заменяць перавагі звычайных чалавечых стасункаў. Напрыклад, дзе яшчэ ў Мінску, як не ў нас, маладыя чалавек можа ў нефармальнай абстаноўцы напрамую задаць пытанне паслу замежнай дзяржавы, уступіць у дыялог з беларускімі навукоўцамі, пісьменнікамі, паэтамі і мастакамі з сусветнай вядомасцю, якія нядаўна вярнуліся з далёкай краіны. Адна справа — сухая даведачная інфармацыя з Інтэрнэту, зусім іншая — жывыя ўражанні відавочцы-суайчынніка.

Наша арганізацыя на працягу многіх дзесяцігоддзяў аб'ядноўвала і аб'ядноўвае самых адметных прадстаўнікоў нацыянальнай інтэлігенцыі. Сёння многія з іх узначальваюць таварыствы дружбы з рознымі краінамі. Напрыклад, такі пачэсны грамадскі абавязак выпаў нашым слынным акадэмікам Яўгену Канаплю — таварыства «Беларусь—Японія», Міхаілу Высоцкаму — «Беларусь—Карэя», Георгію Паплаўскаму — «Беларусь—Швейцарыя, Алегу Роману — «Беларусь—Індыя», прафесару Віктару Шадурскаму — «Беларусь—Францыя». Пасля камандзіровак за мяжу яны заўсёды робяць нефармальныя справаздачы на сустрэчах у Доме дружбы.

— Ведаеце, паслухаць разумных людзей заўсёды прыемна і карысна. Скажыце, а вашы маладыя сябры-студэнты ў сценах Дома дружбы выступаюць пераважна ў ролі статыстаў-слухачоў ці бяруць удзел у канкрэтных мерапрыемствах?

— Хачу падкрэсліць, што ў рэалізацыі нашых многіх праграм і праектаў удзельнічаюць маладыя. Ды і без іх нашаму нешматлікаму калектыву штатных супрацоўнікаў БелТД наўрад ці ўдалося б штогод праводзіць каля сотні мерапрыемстваў. Сярод іх асабліва інтарэс для маладога пакалення выклікаюць тыя, якія носяць пазнавальна-адукацыйны характар: семінары, «круглыя сталы», тэматычныя краінавыя сустрэчы, літаратурна-музычныя вечары, прысвечаныя вядомым дзеячам беларускай і замежнай культуры, мастацкія выставы твораў нашых сяброў з іншых краін, спатканні з замежнымі гасцямі Дома дружбы.

Цікавая і разнастайная тэматыка дзейнасці таварыства «Беларусь—Балгарыя», якое ўзначальвае прафесар Генадзь Цыхун. Штогод там адзначаюцца нацыянальныя святы Балгарыі: Дзень вызвалення, Дзень балгарскага пісьменства, юбілейныя даты дзеячаў балгарскай культуры. Вядома, не абыходзіцца без удзелу маладых. Вось і зараз яны разам з членамі таварыства актыўна дапамагаюць рыхтаваць у рамках маючых адбыцца ў Мінску Дзён Балгарыі (сёлета яны прысвечаны 130-годдзю вызвалення ад асманскага іга) маладзёжную канферэнцыю і «круглы стол». Адна з іх галоўных тэм: удзел беларусаў у той вызваленчай вайне Расіі супраць захопнікаў Балгарыі.

— А ці ёсць у вас чыста маладзёжныя праграмы і праекты?

— Зразумела, ёсць. Праўда, на вялікі жаль, з-за вострага недахопу сродкаў мы не можам тут шырока разгарнуцца. Тым не менш мы практыкуем маладзёжныя міжнародныя адукацыйныя, гуманітарныя, спартыўныя праекты, па меры магчымасці садзейнічаем студэнцкім і школьным абменам, правядзенню сустрэч беларускай моладзі з вядомымі прадстаўнікамі замежнай культуры. Характар устойлівай і доўгатэрміновай праграмы набывае маладзёжны абмен з клубамі нямецка-беларускай дружбы Майнц—Мінск і Бон—Мінск.

У бліжэйшыя пяць гадоў мы мяркуем прадоўжыць развіццё маладзёжных праграм, часцей праводзіць з удзелам маладых семінары, конкурсы, фестывалі, спрыяць наладжванню сувязяў з замежнымі маладзёжнымі арганізацыямі. Таксама будзем больш цесна супрацоўнічаць з беларускімі ВНУ, прыцягваць студэнтаў да ўдзелу ў рабоце таварыстваў дружбы БелТД.

— Агульнавядома, што цяпер сур'ёзныя маладыя людзі старанна вывучаюць замежныя мовы. Ці маюць яны шанцы павысіць у вас свой моўны ўзровень?

— Якраз зацікаўленасць моладзі ў авалоданні замежнымі мовамі і вызначыла новы напрамак дзейнасці нашай грамадскай арганізацыі. Мы з задавальненнем працуем з усімі ахвотнікамі выкарыстоўваць і паляпшаць веданне замежнай мовай праз удзел у нашых міжнародных адукацыйных праектах. Апошнім часам узрасла цікаўнасць маладых да краіназнаўчых тэматычных вечароў на замежных мовах з удзелам акрэдытаваных у Беларусі дыпламатаў, конкурсаў на той ці іншай мове. Удзел у іх дапамагае хутчэйшаму авалоданню выбранай мовай. Прычым не толькі шырока распаўсюджанымі англійскай, французскай і нямецкай. Апошнім часам набыў папулярнасць конкурс японскай мовы. Летась ён прайшоў у нас у пяты раз. Нашы студэнты прадэманстравалі добрае веданне мовы, а лепшыя з іх потым удзельнічалі ў Маскве ў конкурсе японскай мовы сярод моладзі краін СНД. Сёлета у сакавіку нашым японістам будзе дадзена магчымасць праверыць свае веды ў час правядзення вечара дружбы беларускай і японскай моладзі.

— У Мінску вучыцца шмат замежных студэнтаў. Ці ведаюць яны дарогу ў Дом дружбы?

— Упэўнены, што большасць ведае шлях да нас. У беларускіх ВНУ сёння атрымліваюць вышэйшую адукацыю каля тысячы кітайскіх студэнтаў. Для многіх маладых кітайцаў, якія часова жывуць у Мінску (паводле іх жа прызнання), Дом дружбы стаў другім домам. Пад яго гасцінным дахам яны, у тым ліку і супрацоўнікі пасольства, пастаянна праводзяць канцэрты, вечарыны кітайскай прозы і паэзіі, мастацкія выставы. Часта прыходзяць да нас з беларускімі сябрамі вялікімі кампаніямі. Традыцыйнай нагодай для іх сустрэч стала святкаванне ў Доме дружбы Новага года па ўсходнім календары. Яно праходзіць цікава, маляўніча і экзатычна.

Кітайцы — студэнты беларускіх вышэйшых музычных навучальных устаноў ахвотна выступаюць з невялікімі імправізаванымі канцэртамі, знаёмяць нашых гасцей з культурнымі традыцыямі і мастацтвам свайго народа. Таксама ў нас часта бываюць в'етнамскія, туэцкія студэнты. Апошнія былі аднымі з ініцыятараў правядзення вечара, прысвечанага Дню Турцыі на турэцкай мове. Прайшоў ён вельмі цікава.

Такія вечары дазваляюць беларускай моладзі дакрануцца да культуры, традыцый, побыту іншых народаў і тым самым узбагаціць сябе.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск №3 (571)
аддзел рэкламы 287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Прадаецца

■ Кватэра 2-пакаёвая ў Мінску па вул. Асіпенкі (балкон, тэлефон).
Тэл. 8 017 233 33 40, сот. 325 67 07.

■ Пачатае будаўніцтва 2-кватэрнага дома з майстэрняй (11 км ад Брэста, газ, вадаём, лес) — кампаньёну.
Тэл.: 8 029 801 69 81, 8 029 601 69 81.

■ Кватэра 3-пакаёвая, кааператыўная (балкон, тэлефон, гараж) у г. Гарадок, нядорага.
Тэл. 8 029 216 17 09.

■ Дом з усімі гаспадарчымі пабудовамі ў Вілейскім раёне, в. Любань.
Тэл. 754 52 55.

■ Драўляны недабудаваны дом у в. Каменка.
Тэл. 8 01514 34 547.

■ Каляска дзіцячая, б/к, нядорага.
Тэл. 8 01728 55 003.

■ Мікрааўтобус «Івека дэйлі», 1991 г.в., 2,5 Д, белы, 15 месцаў, можна па безнаяўным разліку.
Тэл.: 8 01597 716 97, сот. 617 16 97, 285 02 59.

■ Воз конны на гумавым хаду, зброуя, плуг, сена, кармавыя караняплоды.
Тэл. 8 01794 46 235.

Куплю

■ Трактар МТЗ-50, -80 для сябе, дорага.
Тэл.: 8 029 77 44 981, 8 01717 569 12.

■ Дом, частку дома, пакой да 5 тыс. у.а., да 60 км ад Мінска.
Тэл. 8 029 743 32 07.

■ Дом.
Тэл. 8 029 778 33 38.

■ Памяшканне пад магазін, офіс, вытворчасць, склад.
Тэл. 8 029 682 14 42.

■ Матаблок.
Тэл. 8 029 183 44 70.

■ Трактар МТЗ.
Тэл. 8 029 655 07 16.

Рознае

■ Мяняю кватэру 3-

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Наш чалавек!

На добрую памяць

...Здалёк

Дзіцячы пакой. Цішыня. Малая за сталом.

— Што ты тут творыш? — пытае матуля.

— Ды вось, — адказвае дачка, — сказалі ў садку табе падарунак зрабіць. Сяджу, малюю... Ой, трэба ж, каб ты не ведала?! Каб атрымала і ахнула... А ты ўжо ўбачыла. І што — цяпер не ахнеш?

— Ахну! Абавязкова ахну! — абяцае маці.

— Ну то глядзі ж... Каб не забылася...

Тым, хто бачыць вышыванкі Еўдакіі Якаўлеўны Загорцавай з вёскі Залессе Чачэрскага раёна, нагадваць, «каб ахнулі» не трэба. Самі стаяць, любуюцца, абмяркоўваюць.

Што да прыезджых — у тых наогул мову адымае... Бо хіба ж можна нешта прамовіць, убачыўшы дыван (!) памерам два на чатыры (!) вышыты (!) крыжыкам. Верыць таму вочы адмаўляюцца. Памацаць трэба, пагладзіць, на другі бок паглядзець, адступіцца — аціць кампазіцыю. Ну а потым, зразумела ж, распытаць: на чым гэта вышыта, адкуль малюнак і ніткі, адкуль майстэрства, адкуль нарэшце час?

Адказы ў Еўдакіі Якаўлеўны такія ж шчырыя, як і самі творы. Кшталту — вышывае з маленства, са школы. Пачынала з драбязы — з сурвэтак, навалак, фартушкоў, рушнікоў ды набожнікаў... Ідзя дывана прыйшла, можна сказаць, выпадкова, разам з вялікім кавалкам звычайнай мешкавіны. Яе калгас купіў, каб накрываць машыны са збожжам. Кавалак застаўся. І... Ну, не тое, каб валяўся... Проста не патрэбны быў. І «дрэнна ляжаў». Вось яны з сяброўкай і падабралі — вочы загарэліся...

Малюнак для дывана яна прыдумала сама. Ніткі — часткова купляліся, часткова — прала матуля (на гэта яна вялікай майстрыхай была...), часткова... «Бурылася» нешта з ранейшых работ.

А што да часу, — то на любімы занятак, лічыць Еўдакія Якаўлеўна, яго заўсёды знойдзеш. Было б жаданне. Яна вось, вышываючы той дыван, ужо мела сям'ю, дзяцей, працавала, завочна вучылася ў тэхнікуме, спявала ў хоры. Вышывала вечарамі ды пасучы кароў.

Зрэшты, чаму вышываЛА? ВышываЕ... Па-ранейшаму. Што цікава — нават без акуляраў.

Што, мо, яшчэ цікавей, — творы свае не прадае, хоць многія, «паахаўшы», і прасілі. А вось занесці ў Дом культуры (упрыгожыць перад нейкай падзеяй), — гэта калі ласка. У бібліятэку — таксама. Можна яшчэ аддаць — дзецям сваім, унукам, а то і проста добраму чалавеку. На добрую памяць.

Валянціна ДОЎНАР.

«Сто дзён» знаўцаў беларускай мовы

У польскіх гарадках Бельску Падляскім і Гайнаўцы прайшлі ўрачыстыя вечары выпускнікоў агульнаадукацыйных ліцэяў з дадатковым навучаннем беларускай мовы.

Так, сёлета Гайнаўскі ліцэй, які, дарэчы, заняў летась 30-е месца ў рэйтынгу ліцэяў Польшчы, заканчвае навучанне 120 вучняў. У Бельскім ліцэі беларускую мову ў пяці выпускных класах вывучаюць 164 вучні, а сам ліцэй у рэйтынгу знаходзіцца на 45-ым месцы.

Вечары знаўцаў беларускай мовы атрымалі назву «Сто дзён» і праводзяцца штогод напярэдадні выпускных экзаменаў. Днямі ў госці да навучэнцаў завіталі былыя выпускнікі ліцэяў, кіраўнікі органаў мясцовага самакіравання, ганаровыя госці, прадстаўнікі рэгіянальных СМІ.

Сярод запрошаных былі пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка і генконсул Беларусі ў Беластоку Міхаіл Аляксейчык. Яны пажадалі выпускнікам паспяховай здачы экзаменаў, а кіраўніцтва і настаўнікаў ліцэяў падзякавалі за высокі ўзровень арганізацыі навучання, падтрымку беларускай мовы і культуры, захаванне беларускіх традыцый. Нашы дыпламаты перадалі ліцэям бібліятэчкі (па 100 кніг) вучэбна-метадычнай літаратуры.

Леанід ТУГАРЫН.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.02	16.43	8.41
Віцебск —	7.57	16.28	8.31
Магілёў —	7.53	16.33	8.40
Гомель —	7.44	16.36	8.52
Гродна —	8.16	16.59	8.43
Брэст —	8.11	17.06	8.55

Месяц

Поўня.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Максіма, Пятра;*
К. *Ганны, Валерыя, Здзіслава, Зянона, Міхала, Францішка.*

НАДВОР'Е на заўтра



— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

Геамагнітныя ўзрушэнні

2 гадз.	5 гадз.	8 гадз.	11 гадз.	14 гадз.	17 гадз.	20 гадз.	23 гадз.

...у суседзяў

ВАРШАВА	КІЕЎ	РЫГА
+6..+8°С	0..+2°С	+5..+7°С
ВІЛЬНЮС	МАСКВА	С.-ПЕЦЯРБУРГ
+1..+3°С	-2..0°С	+1..+3°С

Дзве даты

29 студзеня

1588 год — 420 гадоў таму кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт III Ваза зацвердзіў Трэці Статут Вялікага княства Літоўскага — збор законаў феадальнага права, унікальны помнік беларускага пісьменства і юрыдычнай думкі. Дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі да 1840 года. Складаўся з 14 раздзелаў па розных напрамках дзяржаўнага права. Юрыдычна замацоўваў адносіны паміж ВКЛ і Польшчай пасля заключэння Люблінскай уніі, захоўваючы самастойнасць дзяржаўных устаноў, арміі, заканадаўства, эканомікі, грашовай сістэмы ВКЛ. Абвяшчаў прынцып верацярпімасці, уводзіў крымінальную адказнасць шляхты за забойства простага чалавека і інш. Выдадзены на беларускай мове ў віленскай друкарні Мамонічаў.

1886 год — Нямецкі інжынер Карл Фрыдрых Бенц запатэнтаваў аўтамабіль на бензінавым рухавіку. Дарэчы, сам Бенц называў машыну «веласіпедам».

Цытата дня:

«Сапраўдны аптымізм грунтуецца не на перакананні, што ўсё будзе добра, а на ўпэўненасці, што не ўсё будзе дрэнна».

Жан Дзютур.

Простыя рэчы

Некалі, у семідзесятых, рэдактар аддзела паэзіі аднаго з літаратурных часопісаў, адбіраючы мае вершы да друку, доўга глядзела на старонку з адным вершам. Адклала яго ўбок. Потым зноў узяла ў рукі, перачытала. І зноў адклала.

— Чаму не? — асмеліўся запытацца.

— Верш нармальны, але неактуальна.

А вершык быў простым. Дзіцячы ўспамін пра тое, як забілі кабана, як суседзі спраўляюць пагалоўшчыну. А мы, дзеці, бавімся на дварышчы, падышлі да таго месца, дзе адбываўся гэты самы забой, дзе на снезе відаць яшчэ кроў, якую пусціў пад нажом парсюк. Былі там і такія радкі:

Жудасна ад чырвані прыталай,
Але больш вяселля ад таго,
Што цяпер хапае ў хаце сала
Аж да новых, спуджаных снягоў.

Наколькі я сёння разумею, неактуальнасць таго верша ў той час рэдактарка ўбачыла ў тым, што савецкая рэчаіснасць з яе поўным задавальненнем патрэб працоўных ны сад, асветлены з хаты. І раптам у гэта акно з таго саду даволі спрытна гоцнуў чалавек...

Ускочыў, выхапіў з-пад пінжака (пад гальштукам!) добры апалак сала, пляснуў яго на стол, сказаўшы: «Мой уклад!» — і працягнуў мне праз стол руку...»

У Васіля Быкава ўзгадваецца мне суровейшае, ваеннае. Бадай што з першай яго аповесці «Жураўліны крык». Прыхымісты і малалюдзімы баец Пшанічны, выкапаўшы сабе акоп, «выцер аб палу шыняля запэцканыя рукі і развязаў рэчавы мяшок. Там баец трымаў на галодны час акраец здабытага ў нейкай вёсцы хлеба і добры кавалак сала. Ён даўно ўжо прагаладаўся і хацеў есці, але на людзях усё не наважваўся рабіць гэта, бо тады трэба было падзяліцца, а дзяліцца Пшанічны не хацеў... І цяпер, напрацаваўшыся і нямала згаладаўшыся, Пшанічны разгарнуў у прыцемках паперку, дастаў з кішэні складаны ножык на медным ланцужку і, адрэзаўшы палову кавалка, пакроіў яго на дробныя тлустыя скрылёчкі. Асмусульман, іўдзеяў. Усё гатавалася на так званым камбітлушчы. А што ў гэты камбітлушч уваходзіць — малавядома. Быў у нас таджык Музафараў, які ў сталоўцы дэманстратыўна адмаўляўся ад свінога сала, якое ў вараным выглядзе падавалася на стол у якасці мясной стравы. Але на вучэннях адноўчы бачу, што мой камандзір (ён быў сяржантам, камандзірам нашага аддзялення) зайшоў за «бээмпэшку», пакроіў на сваёй планшэтцы «венгерскае» і з апетытам упівае. Што ж, мароз і голад узялі сваё. І ніхто з нас не пасміхаўся. Потым я ўжо ў Свяшчэнным пісанні вычытаў, што нават у пост людзям падарожным дазвалялася парушаць гэтыя самыя законы посту. Харчуешся тым, што ёсць пад рукой.

А ўвогуле беларусы здаўна сала, якое прызвычаіліся мы называць уласна салам, называлі салянінай. А вось салам называлі той унутраны тук, тлушч, які ляжыць у свінні на кішках. Адпаведна каровін, авечы тлушч называлі лоем. А заечы тлушч называўся скромам, птушыны — шмальцом. Рыбін так і быў — тук.

Сёння гэтыя назвы адышлі, нават перамяшаліся. Але сала застаецца салам. З жыцця нельга нешта выкінуць, пра нешта забыць. Яно абавязкова вернецца. Быў нейкі непрацяглы час, калі нашым дзяржаўным сцягам развіваўся бел-чырвона-белы. А ў асяроддзі вайскоўцаў, якімі тады былі літаральна перапоўненыя мае родныя Паставы, гэты сцяг меў сваю назву — «сала з праслойкай». І гэта не лічу абразай. Вайскоўцы тады апынуліся ў вельмі няпростай сітуацыі. Беларусь стала незалежнай, адмовілася ад ядзернай зброі. А ім куды падацца? Вось нехта і пажартаваў. Жартаваў з горыччу. Але жарт падхапілі. Сёння ў нас іншы сцяг, іншы герб. Але ж галоўнае захавалася: мы — незалежная дзяржава.

Сала застаецца салам. Ёсць у мяне сябар, дастаткова заможны чалавек, які можа сабе дазволіць каштаваць розныя, нават экзатычныя прадукты. Але яго прыхільнасць — сала. Ці ён недзе вычытаў, ці недзе пачуў, а верагодней за ўсё гэта ад не вельмі багатага нашага дзяцінства: сала ён лічыць лепшым наедкам, закускай — тым больш. Неяк паехалі мы сяброўскай кампаніяй у лес, на мужчынскую вечарынку. Узялі, зразумела, выпіць, а на закуску — па яго ж прапанове — толькі хлеб ды сала. Ладны такі кавалак. І вось размясціліся на зімовым улонні. Вогнішча расклалі. Дасталі хлеб ды сала. А ножыка, хоць бы нейкага сцізорыка, не знайшлося. Чарка ёсць, хлеб ды сала ёсць. А вось парэзаць — няма чым. І давялося па чарзе адгрызаць ад таго аполка сала, адломваць хлеб. Нічога. І песню потым заспявалі.

Але ўсё-такі трэба прызнацца: люблю сала, парэзанае на тонкія скрылькі. І каб да яго яшчэ агурочак салёны...

Алесь КАСЦЕНЬ.
вёска Касцяні Пастаўскага раёна.

САЛА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ну проста не дазваляе рабіць у сямейных стасунках разлік на назапашанае сала.

Але ж сала назапашвалі. Яго салілі ў спецыяльных скрынях, закладвалі ў кублы. Яно магло захоўвацца нават і не адзін год. Бывала, рыжэла, але ад гэтага не страчвала сваёй галоўнай, спажыўнай якасці, як цяпер гавораць, энергетычнай каштоўнасці. Яно сапраўды сілкавала, надавала мужчынскім і жаночым рукам сілу ў цяжкі час сельскагаспадарчых работ. Ды надае і цяпер.

Чамусьці існуе стэрэатып: сала і ўкраінскі чалавек. Дазвольце не пагадзіцца. Сала гэтак жа звязана і з беларускім чалавекам. І з людзьмі іншых нацыянальнасцяў. Ды ўспомнім тое ж польскае szpik.

Некалі прачытаў раман Багамолава «У жніўні сорак чацвёртага». Многім беларусам ён вядомы па кінафільме, знятым на нашай, айчыннай кінастудыі. Твор у многім супярэчлівы. Але не ў гэтым справа. З таго чытання мне запомнілася: супрацоўнікі савецкай контрразведкі, «Смерша» вядуць пошук нямецкіх разведчыкаў і адной з улік прысутнасці тых разведчыкаў з'яўляецца знойдзены імі пакецік з-пад сала, той порцыі, якая выдавалася нямецкім парашутыстам.

А помніце некалі славуты, а сёння крыху і занядбаны шолахаўскі «Лёс чалавека»? За смелыя адказы і нязломны дух савецкі ваеннапалонны ў лагеры ад немцаў атрымаў што? Бохан хлеба і кавалак сала, які ў бараку ён просіць падзяліць на ўсіх пароўну.

Увогуле ў часы навал, ваенных і рэвалюцыйных, у часы грамадзянскіх крызісаў сала станавілася каштоўнасцю, якая была ўпоравень нават і золату. Яно давала чалавеку магчымасць выжыць. У старажытным Рыме плебс патрабаваў хлеба і відовішчаў. Але ж не толькі хлебам сілкаваўся старажытны рымлянін. Было ў яго і сала. Асабліва патрэбнае было яно легіёнам у час паходаў.

Салдату ў час яго бясконцых пераходаў патрэбна харчавацца, патрэбна нечым аднаўляць свае сілы. І тут сала мае першараднае значэнне.

Ну, як жа не ўзгадаць класікаў. Нашы Янка Купала і Якуб Колас пры першай сваёй сустрэчы, яшчэ маладымі і зусім беднымі паэтамі, сілкаваліся таксама салам. Была пляшка, а да яе — сала. Потым Колас у «Новай зямлі», распавядаючы пра багаты сялянскі стол у леснічоўцы, міжволі ўсклікнуў:

Мой мілы Янка, мой Купала!
Ў агульны вір нас доля ўгнала.
Чаму ж, чаму часінай тою
Мы не спаткаліся з табою,
Каб стол сялянскага банкету
Развесяліў душу паэту?

Мае любімыя класікі Янка Брыль і Васіль Быкаў. У Брыля таксама з весялосцю:

«Дык мы сядзім сабе, спяваем за сталом. Акно адчынена ў зялёнае таццяне ён загарнуў у газеціну і схаваў на спод напакаванай рознай драбязой торбы».

Той, другой, паловай кавалка Пшанічнаму ўсё-такі не па сваёй ахвоце давялося падзяліцца з іншымі байцамі. Але ж бачыце, якое значэнне ў тых умовах мела такая простая ежа — сала.

Успамінаецца і маё вайсковае. Вялікія вучэнні ў нашай мотастралковай дывізіі праводзіліся ў асноўным зімою. Маршы шматтоннай тэхнікі на заснежаных, умёрзлых дарогах і палях не наносілі шкоды тым жа пасевам. І вось нас папярэджваюць, што адбудзецца чарговае вялікае вучэнне. Першае, што мы робім у аддзяленні: збіраем грошы і закупляем у краме ваеннага гарадка сала. Чамусьці мы аддавалі перавагу так званаму (прынамсі, на цэнніку яно было так пазначана) венгерскаму. Абсыпанае чырвоным перцам. У аддзяленні сем чалавек. Куплялі па кілаграму на брата. І за пару тыдняў вучэння сала гэта разыходзілася. Не, безумоўна, нас на вучэннях кармілі добра. Быў і боршч з паходнай кухні, і каша, прыпраўленая кансервамі. Але кухня магла і прыпазніцца. А вось адрэзаць акраец сала, ды пакласці яго на лусту прыхаванага хлеба. Ды з'есці гэта на марозе — смаката. Сала захоўвалі ў баявых машынах пяхоты. Начаваць тут не дазвалялася. І ўвогуле мы на іх толькі перамяшчаліся на далёкія адлегласці, а ў асноўным «ваявалі» пешым парадкам. Але на стаянках пастаянна менавіта каля «бээмпэшак» таўкліся салдаты. Менавіта з-за сала. У нашых войсках служыла шмат мусульман — з Сярэдняй Азіі, з Каўказа. І яны вельмі хутка засвойвалі ісціну: на марозе для падтрымання сілы найбольш карыснае сала. Ды і нельга было ім прытрымлівацца свайго запавету. У тыя часы ў арміі ўсё гатавалася аднолькава для ўсіх — праваслаўных, каталікоў, татыны ён загарнуў у газеціну і схаваў на спод напакаванай рознай драбязой торбы».

Ускочыў, выхапіў з-пад пінжака (пад гальштукам!) добры апалак сала, пляснуў яго на стол, сказаўшы: «Мой уклад!» — і працягнуў мне праз стол руку...»

У Васіля Быкава ўзгадваецца мне суровейшае, ваеннае. Бадай што з першай яго аповесці «Жураўліны крык». Прыхымісты і малалюдзімы баец Пшанічны, выкапаўшы сабе акоп, «выцер аб палу шыняля запэцканыя рукі і развязаў рэчавы мяшок. Там баец трымаў на галодны час акраец здабытага ў нейкай вёсцы хлеба і добры кавалак сала. Ён даўно ўжо прагаладаўся і хацеў есці, але на людзях усё не наважваўся рабіць гэта, бо тады трэба было падзяліцца, а дзяліцца Пшанічны не хацеў... І цяпер, напрацаваўшыся і нямала згаладаўшыся, Пшанічны разгарнуў у прыцемках паперку, дастаў з кішэні складаны ножык на медным ланцужку і, адрэзаўшы палову кавалка, пакроіў яго на дробныя тлустыя скрылёчкі. Асмусульман, іўдзеяў. Усё гатавалася на так званым камбітлушчы. А што ў гэты камбітлушч уваходзіць — малавядома. Быў у нас таджык Музафараў, які ў сталоўцы дэманстратыўна адмаўляўся ад свінога сала, якое ў вараным выглядзе падавалася на стол у якасці мясной стравы. Але на вучэннях адноўчы бачу, што мой камандзір (ён быў сяржантам, камандзірам нашага аддзялення) зайшоў за «бээмпэшку», пакроіў на сваёй планшэтцы «венгерскае» і з апетытам упівае. Што ж, мароз і голад узялі сваё. І ніхто з нас не пасміхаўся. Потым я ўжо ў Свяшчэнным пісанні вычытаў, што нават у пост людзям падарожным дазвалялася парушаць гэтыя самыя законы посту. Харчуешся тым, што ёсць пад рукой.

А ўвогуле беларусы здаўна сала, якое прызвычаіліся мы называць уласна салам, называлі салянінай. А вось салам называлі той унутраны тук, тлушч, які ляжыць у свінні на кішках. Адпаведна каровін, авечы тлушч называлі лоем. А заечы тлушч называўся скромам, птушыны — шмальцом. Рыбін так і быў — тук.

Сёння гэтыя назвы адышлі, нават перамяшаліся. Але сала застаецца салам. З жыцця нельга нешта выкінуць, пра нешта забыць. Яно абавязкова вернецца. Быў нейкі непрацяглы час, калі нашым дзяржаўным сцягам развіваўся бел-чырвона-белы. А ў асяроддзі вайскоўцаў, якімі тады былі літаральна перапоўненыя мае родныя Паставы, гэты сцяг меў сваю назву — «сала з праслойкай». І гэта не лічу абразай. Вайскоўцы тады апынуліся ў вельмі няпростай сітуацыі. Беларусь стала незалежнай, адмовілася ад ядзернай зброі. А ім куды падацца? Вось нехта і пажартаваў. Жартаваў з горыччу. Але жарт падхапілі. Сёння ў нас іншы сцяг, іншы герб. Але ж галоўнае захавалася: мы — незалежная дзяржава.

Сала застаецца салам. Ёсць у мяне сябар, дастаткова заможны чалавек, які можа сабе дазволіць каштаваць розныя, нават экзатычныя прадукты. Але яго прыхільнасць — сала. Ці ён недзе вычытаў, ці недзе пачуў, а верагодней за ўсё гэта ад не вельмі багатага нашага дзяцінства: сала ён лічыць лепшым наедкам, закускай — тым больш. Неяк паехалі мы сяброўскай кампаніяй у лес, на мужчынскую вечарынку. Узялі, зразумела, выпіць, а на закуску — па яго ж прапанове — толькі хлеб ды сала. Ладны такі кавалак. І вось размясціліся на зімовым улонні. Вогнішча расклалі. Дасталі хлеб ды сала. А ножыка, хоць бы нейкага сцізорыка, не знайшлося. Чарка ёсць, хлеб ды сала ёсць. А вось парэзаць — няма чым. І давялося па чарзе адгрызаць ад таго аполка сала, адломваць хлеб. Нічога. І песню потым заспявалі.

Але ўсё-такі трэба прызнацца: люблю сала, парэзанае на тонкія скрылькі. І каб да яго яшчэ агурочак салёны...

Алесь КАСЦЕНЬ.
вёска Касцяні Пастаўскага раёна.

Зімовыя зацемкі

Гэта няпраўда, што ў сорак гадоў

ЖЫЦЦЁ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА,

яно можа пачацца ў...

Жыла-была жанчына. Ранкам спяшалася на работу, вечарам спраўлялася па дому, мыла-варыла-прыбірала, дзяцей адпраўляла ў школу, накрывала сталы ў святы, любіла хадзіць у тэатр і на канцэрты. Знаёмая карціна, праўда? Ледзь не кожную другую трэцюю з нас можна прыкласці да гэтага апісання. Не тыпова толькі тое, што адбылося з ёй далей, але пра гэта крыху пазней.

Ларыса Дзмітрыеўна была жаночым доктарам. І трэба заўважыць, добрым доктарам, да яе імкнуліся трапіць на прыём. Нарадзілася і вырасла яна ў Расіі, выйшла замуж адразу пасля інстытута за ваеннага. Яго вельмі хутка накіравалі ў Брэст, тут яны і аселі. Як расказвала сама жанчына, заўсёды старалася быць добрай гаспадыняй, усё імкнулася рабіць сама, усюды паспець. А калі выраслі дзеці і сталі студэнтамі, яны з мужам ціха разышліся, проста зразумелі, што адносіны вычарпаны і нічога больш не ўтрымлівае. Неўзабаве прадалі кватэру і пачалі будаваць адразу тры: для яго, для яе і для старэйшага сына, які меў нявесту. Вядома, даводзілася цяжка. Здымаць кватэру, штомесяц уносіць плату за будоўлю, — на паўсядзённыя патрэбы не хапала. А тут прыйшоў час пенсіі. У галіновай паліклініцы, дзе працавала Ларыса, праводзілася чарговая рэарганізацыя, аднаго спецыяліста яе профілю скарачалі. Навісла пагроза застацца без работы з усімі наступствамі.

І гэта стала штуршком для новага жыцця. Ларыса Дзмітрыеўна ўладкавалася на работу аж у трох прыватных медустановах. Праз год уехала ў сваю кватэру. А яшчэ праз год здала на вадзіцельскае пасведчанне і купіла машыну, першую ў сваім жыцці. Цяпер паспявала заехаць з работы на работу без спешкі, быў час паабедаць нармальна, а не з'ядаць на хаду з ранку прыгатаваны бутэрброд. Жыццё набывала роўныя абрысы. З прыяцелькамі рэгулярна наведвалі саўну, басейн, хадзілі на ўсе канцэрты прыезджых зорак. Адна з іх кампаній любіла паўтараць: «Мы ўсё аддалі соцыуму, час пажыць для сябе». Так яно, відаць, і цягнулася б да гэтай пары, каб аднойчы сын напаўжартам не паказаў у Інтэрнэце здымак імпазантнага брытанскага пенсіянера, які шукае спадарожніцу жыцця. Яна з цікаўнасці ўступіла ў перапіску. Некалькі месяцаў яны абменьваліся рамантычнымі пісьмамі, а потым ён запрасіў у госці.

Пагасціла некалькі тыдняў у Лондане, і хто б мог падумаць, дадому вярнулася жонкай падданага Яе Вялікасці. Прыехала, каб падрыхтавацца да ад'езду. Першае, што я спытала тады ў Ларысы Дзмітрыеўны: «Вы не баіцеся? Іншая культура, іншы менталітэт, ды ці мала што: ён прывык да аднаго ладу жыцця, вы да іншага». Мая знаёмая была гатова да такіх пытанняў: «Зусім не баюся. Калі што, прыеду дадому, буду зноў працаваць, прымаць іншае грамадзянства пакуль не збіраюся». Лонданскі муж Ларысы купіў домік на іспанскім узбярэжжы і прапанаваў жонцы правесці іх «трэці ўзрост» у цудоўнай мясціне з гаючым марскім паветрам.

Больш за год я не мела звестак ад Ларысы Дзмітрыеўны. І вось пад Каляды прыйшла паштоўка з невялікім пісьмом. Яна піша, што вельмі шчаслівая. Яны з мужам многа падарожнічаюць, вывучаюць мовы, ён — рускую і іспанскую, яна — іспанскую і ўдасканальвае англійскую. З самага пачатку яе выручыла англійская і тое, што заўсёды была стараннай вучаніцай. У інстытуце на курсе некалі яе называлі першай па замежнай мове. Праз трыццаць з лішнім гадоў засталося паўтарыць па падручніках — і загаварыла нядрэнна. Цяпер, вядома, вымаўляе як лэдзі і адчувае сябе лэдзі.

Вось так бывае, дарагі чытач. Нібы ў казцы. А ў нас да нядаўняга часу пры выхадзе на пенсію пісалі: «Па старасці». Дзякуй Богу, у нашай краіне пішуць цяпер: «Па ўзросце», што з'яўляецца правільным з усіх пунктаў гледжання. А ў некаторых краінах былога Саюза засталася фармулёўка, якую зрабіў нейкі маласведомы чыноўнік гадоў пяцьдзесят ці болей таму. Уявіць сабе толькі, што ў дакументах Эдзіты П'ехі або Сафіі Ратару нехта можа напісаць: пенсія па старасці.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Комиссия Национального банка Республики Беларусь по конкурсному управлению ОАО «ДЖЕМ-БАНК» проводит аукцион

по продаже здания Дворца культуры ОАО «ДЖЕМ-БАНК», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 20 (общ. пл. 7628 кв. м, пл. зем. участка — 1,8772 га).

Начальная цена — 10 300 000 000 белорусских рублей без учета НДС.

Размер задатка — 10 % от начальной цены лота с НДС и перечисляется на счет 6630000010023 в ОАО «ДЖЕМ-БАНК», код 731.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится 14 февраля 2008 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 28.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 13 февраля 2008 г. до 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, д. 28, 5-й этаж.

Телефоны для справок: (+37517) 219 84 21, 219 84 16, 219 84.

УНП 100654364

ПРАМЫЯ ПАЛЁТЫ З ТАЛІНА Ў МІНСК

Эстонская нацыянальная авіякампанія Estonian Air у лютым пачне выконваць прамыя палёты з Таліна ў Мінск, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Дэпартаменце па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Беларусі.

Рэйсы будуць выконвацца тры разы на тыдзень. Першы рэйс адбудзецца 11 лютага. Палёты будзе ажыццяўляць самалёт SAAB 340 умяшчальнасцю 33 пасажыры.

Зімовыя зацемкі

КЛЁВА!

ПОШУК ШЧУПАКА

(Працяг. Пачатак у нумары за 22 студзеня.)

Вядома ж, пры сучасным прагрэсе ў галіне рыбалоўнага спорту гэта рабіць стала лягчэй. Незаменным памочнікам многіх рыбаловаў, асабліва пры лоўлі на вялікіх і незнаёмых вадаёмах, стаў эхалот. Кампактнае і надзейнае прыстасаванне высветліць на экране дысплея рэльеф дна, пакажа глыбіню, наяўнасць рыбы і адлегласць да яе. Безумоўна, гэта аблягчае задачу, але, паводле меркавання некаторых рыбаловаў, пры ўсёй зручнасці і эканоміі часу страчваецца нейкая рамантыка рыбалкі і загадкавасць вадаёма. Рыбалоў спадзяецца ўжо не на асабістую інтуіцыю, вопыт і ўдачу. І радасць ад рыбы, знойдзенай непрадузятым прыборам, не такая яркая і запамінальная. Зразумела, што, акрамя ўсяго, пошук рыбы патрабуе і немалой фізічнай вынослівасці, калі даводзіцца рабіць часам не адзін дзесятак лунак. Тут трэба адзначыць, што добра адладжаны і навостраны ледабур эзэканоміць вам шмат часу і сілаў.

Ці патрэбна зацямненне лунак? Пры лоўлі на глыбіні зацямненне лунак амаль неістотна, але пры лоўлі на водмелях непажадана, каб у ваду трапляла шмат прамых промняў святла. Таму ачышчаць лунку трэба не поўнасцю, а пакідаць у ёй крошкі снегу і лёду. Рассеянае святло не так палохае рыбу, не стварае рэзкага кантрасту цемнаты і святла. Да таго ж пры выважванні шчупака, у момант, калі вы падцягваеце яго да яркай светлавой зоны, ён больш мітусіцца і больш энергічна імкнецца збегчы ў звыклую і выратавальную цемру. Вельмі перспектыўнымі могуць быць пры пошуку шчупака невялікія азёрныя ці рачныя пратокі са слабым цячэннем і дастатковай для стаянак плямістага драпежніка глыбінёй.

На азёрных залівах, злучаных з рачнымі прытокамі, шчупак будзе трымацца да крытычнага кіслароднага балансу і толькі затым прыступіць да заходу туды. Пасля кароткага перыяду адаптацыі на свежай вадзе ён пачне лавіцца ў зоне прытоку. Да моманту заходу пры нармальным кіслародным рэжыме шчупак стаіць уздоўж травяністых берагоў, каля астраўкоў раслінасці, на перападах глыбіняў. Самая вялікая яго канцэнтрацыя — на тым участку, дзе адбываецца прыток вады і адчуваецца яе рух. Там, дзе моц цячэння ўжо сыходзіць на нішто, колькасць шчупака меншая.

Парады бывалых

ЗІМОВАЯ ЛОЎЛЯ ПАДЛЕШЧЫКА

Цячэнне. Лаўлю практычна заўсёды пры яго наяўнасці, таму снасці такім чынам і зробленыя. Пры яго адсутнасці лавіць таксама можна, але снасці патрэбныя зусім іншыя.

Прыкорм. У рыбалоўнай літаратуры некаторыя аўтары пішуць, што зімой прыкорм неактуальны, маўляў, рыба кволая, на яго амаль не рэагуе і за ім далёка не пойдзе. Яе, маўляў, знайсці трэба — тады і без прыкорму абыдзешся. Але я ўпэўніўся, што з ім на цячэнні адназначна лепш. Пасля розных эксперыментаў спыніўся на самым элементарным — ржаны хлеб. Зразумела, можна ў яго нейкія араматызатары і дадаваць. Але можна выкарыстоўваць, прасцей кажучы, у чыстым выглядзе. Ды і зімою з імі вельмі асцярожна трэба працаваць. Хлеб пажадана браць самы свежы — у яго свой тонкі арамат. На рыбалку ідзе 1—1,5 бохана.

Кармушка. Звычайны сеткавы мяшэчак для прыкорму. Ячэйка — 4—6 міліметраў. Хлеб загадзя дома разразаю нажом на невялікія кавалачкі па 3—4 сантыметры. Дома адразу ж набіваю і мяшэчак для прыкорму, каб прыйшоў — і ўсё гатовае, толькі ў лунку застаецца апусціць. Лунку для прыкорму свідрую прыкладна за метр вышэй ад рабочых лунак.

Груз для прыкорму. Улічвайце структуру дна на месцы рыбалкі. Калі яно цвёрдае ці на ім ёсць дастаткова тонкі слой глею — груз кладзём як звычайна, у мяшэчак. Калі слой глею тоўсты — лепш падвязваць груз да мяшка, хай ён знаходзіцца на 10—15 сантыметраў ніжэй. Так ваш прыкорм не будзе пагружацца ў глей, як было б у першым выпадку, а знаходзіцца над ім і, адпаведна, лепш працаваць на цячэнні.

Палатка. Практычна заўсёды яе выкарыстоўваю — нават калі адносна цёпла. Па-першае, у ёй усё ж камфортна. А галоўнае, не бачна — як часта і што ты там выцягваеш з лункі. Гэта для тых яшчэ, хто не любіць рыбачыць у натоўпе.

Вудачкі. Аптымальна для палаткі — дзве лункі. Але гэта не азначае, што і вудачак павінна быць столькі ж. Мой мінімальны ражаны камплект — 4 штукі. Дзве настроеныя адным спосабам, а дзве — другім. Гэта трэба на выпадак абрыву, заблытвання і іншых аналагічных непрыемнасцяў. Васіцца з вудачкай на марозе, ды яшчэ і пры ветры — справа цяжкая. Нават і ў палатцы гэта страта часу. Таму значна прасцей хуценька разматаць запасную. Ну толькі хіба калі рыба не бярэцца — тады заняцца рамонтам снасці, якая выйшла са строю.

Ківок. Пакольк ловім на цячэнні — менавіта яно з'яўляецца крытэрыем для падбору кіўка. Чым большая глыбіня на месцы лоўлі — тым большая ветразёвасць нашай снасці. Нават самую тонкую лёску яно будзе «цягнуць» — і калі ківок тоненькі і слабенькі — яго проста сагне ў дугу і ўбачыць, калі будзе бракца рыба, будзе вельмі праблематычна. Пакідаць яго занадта кароткім таксама нельга па гэтай жа прычыне. Такія — большасць кіўкоў, якія прадаюцца ў магазінах, вы іх бачылі. Патрэбен конусападобны — каля асновы 3 міліметры і 1—1,5 каля кончыка. Я выразаю такія сам — са сталёвай стужкі ад старой рулеткі звычайнымі нажніцамі па метале, 15 сантыметраў даўжыні хопіць. Надзяваеш на ківок 2—3 кембрыкі для фіксацыі/пропуску лёскі — і гатова.

Кручкі. Гэта не праўда, што чым большага памеру мяркуецца лавіць рыбу, тым большыя павінны быць кручкі. Кручок падбіраецца не пад рыбу, а пад прынаду. Паколькі практычна на 100 працэнтаў я лаўлю на матыля, то выкарыстоўваю самыя дробныя — № 16. Ну на крайні выпадак — № 14. Колер — чорны або чырвоны. Светлыя не рэкамендую. Цаўё — кароткае. На кручках не эканомце. Выкарыстоўвайце Owner, Gamakatsu, VMC...

Лёска для павадкоў (манафільная). Выкарыстоўвайце мінімальна тонкую. Таўсцей 0,10 не

рэкамендую. Рыба на самай справе адчувае самае невялікае павелічэн